## Беларусь

Паводле сваёй канстытуцыі, Беларусь ёсць рэспублікай. Яе насельніцтва складае 9,7 мільёна чалавек. Прэзідэнта абіраюць праз наўпроставае галасаванне, а дзвюхпалатны парламент - Нацыянальны сход - складаецца з Палаты прадстаўнікоў (ніжняя палата) і Савета Рэспублікі (верхняя палата). Намінальна прэм’ер-міністр, якога прызначае прэзідэнт, узначальвае ўрад. Аднак насамрэч паўнамоцтвы сканцэнтраваныя ў прэзідэнцкіх структурах. З часу свайго абрання прэзідэнтам у 1994 годзе Аляксандр Лукашэнка ўзмацняў сваю ўладу над усімі інстытутамі і скасоўваў вяршэнства права праз выкарыстанне аўтарытарных сродкаў, фальсіфікацыю выбараў ды адвольнае прыняцце дэкрэтаў. З таго часу прэзідэнцкія выбары не былі свабоднымі і справядлівымі, і парламенцкія выбары 28 верасня не адпавядалі міжнародным стандартам. Грамадзянскія ўлады ў цэлым эфектыўна ажыццяўлялі кантроль над сіламі бяспекі, аднак супрацоўнікі сіл бяспекі па-ранейшаму здзяйснялі шматлікія парушэнні правоў чалавека.

Ступень захавання ўладамі правоў чалавека заставалася вельмі нізкай: урад па-ранейшаму часта здзяйсняў сур’ёзныя парушэнні. Права грамадзян мяняць свой урад было жорстка абмежавана. Урад не здолеў раскрыць палітычна матываваныя знікненні, што адбыліся ў папярэднія гады. Умовы ўтрымання ў зняволенні па-ранейшаму былі надзвычай дрэннымі, зноў паступаць сведчанні пра парушэнні правоў зняволеных і затрыманых. Па-ранейшаму адбываліся адвольныя арышты, затрыманні і зняволенне па палітычных прычынах, за крытыку на адрас афіцыйных асобаў ці ўдзел у дэманстрацыях. Некаторыя суды праводзіліся за закрытымі дзвярыма, без незалежных назіральнікаў. Судовая галіна не была незалежнай, і звычайна выніківі судовых разглядаў былі перадвызначаныя. Урад яшчэ больш абмежаваў грамадзянскія свабоды, у тым ліку свабоды прэсы, выказвання, сходаў, асацыяцый і веравызнання. Урад канфіскоўваў друкаваныя матэрыялы ў актывістаў грамадзянскай супольнасці, закрыў некалькі незалежных выданняў альбо абмежаваў іх распаўсюд. Службы дзяржаўнай бяспекі прымянялі празмерную сілу пры разгоне мірных акцый пратэсту. Па-ранейшаму існавала праблема карупцыі. Рабіліся захады супраць недзяржаўных арганізацый (НДА) і палітычных партый, іх штрафавалі, судзілі і закрывалі. Духоўных лідэраў штрафавалі, пазбаўлялі волі ці дэпартавалі за правядзенне службаў, цэрквы закрывалі ці пазбаўлялі рэгістрацыі, прыходы пазбаўлялі цэркваў. Гандаль людзьмі, як і раней, быў значнай праблемай, хаця ў барацьбе з ім быў дасягнуты пэўны прагрэс. Існавала

дыскрымінацыя супраць цыган, этнічных і сэксуальных меншасцяў, а таксама супраць выкарыстання беларускай мовы. Улады рабілі захады супраць незалежных прафсаюзаў і іх сябраў, жорстка абмяжоўваючы магчымасці працоўных стварaць незалежныя прафсаюзы і далучацца да іх, самаарганізоўвацца і калектыўна весці перамовы.

Адбыліся некаторыя вартыя ўзгадвання падзеі, у тым ліку выхад на волю апошніх дзевяцерых міжнародна прызнаных палітычных зняволеных, вяртанне пасля трохгадовай забароны "Народнай Волі" і "Нашай Нівы", дзвюх вядомых незалежных газет, у дзяржаўную сістэму распаўсюду выданняў, а таксама рэгістрацыя грамадзянскага недзяржаўнага аб'яднання "За Свабоду".

## Забеспячэнне правоў чалавека

Раздзел 1. Забеспячэнне недатыкальнасці асобы, у тым ліку абароны ад:

а) адвольнага або пазазаконнага пазбаўлення жыцця

На працягу года не паступала звестак пра здзяйсненне ўладамі або па іх даручэнні адвольных або пазазаконных забойстваў.

б) знікненняў

Звестак пра знікненні па палітычных ці іншых матывах на працягу года не паступала.

8 красавіка Генеральная пракуратура падоўжыла на чарговыя тры месяцы тэрмін дзевяцігадовага расследавання на факце знікнення ў 1999 годзе былога міністра ўнутраных спраў і лідэра апазіцыі Юрыя Захаранкі.

Не атрымалі развіцця расследаванні, што вядуцца па факце знікнення ў 1999 годзе актывіста апазіцыі Віктара Ганчара і бізнэсоўца Анатоля Красоўскага. У 2006 годзе ўлады прыпынілі расследаванне знікнення і меркаванага забойства ў 2000 годзе журналіста Зміцера Завадскага. Нягледзячы на наяўнасць дадзеных пра дачыненне ўраду да гэтых справаў, улады па-ранейшаму адмаўлялі, што маюць якое-кольвек дачыненне да гэтых знікненняў.

в) катаванняў ды іншых спосабаў жорсткага, бесчалавечнага і прыніжальнага абыходжання і пакарання

**BELARUS**

Закон забараняе такія дзеянні, тым не менш, службоўцы Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Атрада міліцыі асаблівага прызначэння (АМАП) ды іншых спецыяльных службаў па-ранейшаму збівалі затрыманых і дэманстрантаў.

Міліцыянты таксама збівалі падчас затрымання і ў пастарунку тых асобаў, што арганізоўвалі ці прымалі ўдзел у дэманстрацыях ці іншых апазіцыйных акцыях.

10 і 21 студзеня ў Мінску сілы міліцыі спецыяльнага прызначэння выкарысталі сілу для разгону дэманстрацый, арганізаваных прадстаўнікамі малога бізнэсу і актывістамі. У кожнай з дэманстрацый прынялі ўдзел каля 1500 чалавек, якія выказвалі пратэст супраць указа прэзідэнта, што абмяжоўвае магчымасці малога бізнэсу як наймальніка. Больш як 45 прадпрымальнікаў і актывістаў былі затрыманыя. Некаторых міліцыянты збілі ў пастарунку.

25 сакавіка ў Мінску міліцыя выкарыстала сілу для разгону мірнага шэсця "Дзень Волі" ва ўгодкі абвяшчэння першай незалежнай беларускай рэспублікі. У шэсці прынялі ўдзел больш як 1000 дэманстрантаў. Каля 100 асобаў, у тым ліку некалькі замежных журналістаў, былі затрыманыя і арыштаваныя. Незалежныя і замежныя СМІ перадавалі кадры збіцця дэманстрантаў міліцыянтамі атрада спецыяльнага прызначэння.

16 верасня ў Мінску міліцыя разагнала ўдзельнікаў штомесячнай акцыі "Дзень салідарнасці", якія сабраліся, каб нагадаць пра знікненні дзеячоў апазіцыі ў 1999 годзе. Міліцыянты сілаў спецыяльнага прызначэння выціснулі каля 40 ўдзельнікаў з цэнтральнай плошчы і некаторых збілі.

2 верасня Міжнародная федэрацыя правоў чалавека (ФМПЧ) і беларускае праваабарончае недзяржаўнае аб'яднанне "Вясна" выпусцілі сумесную справаздачу "Умовы ўтрымання ў зняволенні ў Беларусі", складзеную на падставе сумоўяў, праведзеных з больш як 30 асобамі. Паводле справаздачы, была атрыманая "значная колькасць сведчанняў пра катаванні і кепскае абыходжанне з падазраванымі падчас крымінальных і адміністрацыйных расследаванняў.

У войску працягвалася практыка дзедаўшчыны са збіццём і прымяненнем іншых гвалтоўных фізічных і псіхалагічных захадаў супраць нядаўніх прызыўнікоў, аднак некаторыя ўмовы палепшыліся. У ліпені Генеральная пракуратура паведаміла, што колькасць зафіксаваных выпадкаў дзедаўшчыны ва ўзброеных сілах скарацілася ўдвая, што знізіўся ўзровень злачыннасці ў войску і што ў

адносінах да 47 вайсковых службоўцаў будуць прыменены нязначныя санкцыі за невыкананне патрабаванняў бяспекі.

Умовы ўтрымання ў турмах і ізалятарах

Умовы ўтрымання ў турмах і ізалятарах па-ранейшаму былі жорсткія і неслі пагрозу жыццю і здароўю, хаця абмежаваныя паляпшэнні і былі адзначаныя пры будаўніцтве некаторых новых устаноў. Не хапала ежы ды лекаў, цёплага адзення і пасцельнай бялізны. Вентыляцыя ў камерах ды агульны санітарны стан былі кепскія. У выніку гэтага шырока распаўсюджаныя былі туберкулёз, запаленне лёгкіх ды іншыя інфекцыйныя захворванні.

У сваёй справаздачы ад 2 верасня МФПЧ і “Вясна” зрабілі выснову, што ўмовы ўтрымання ў турмах краіны “скрайне незадавальняючыя аж да праяваў бесчалавечнага абыходжання”. Сярод тых, з кім праводзілі сумоўі падчас падрыхтоўкі справаздачы, былыя зняволеныя і затрыманыя, сваякі затрыманых, адвакаты, сябры НДА і былы суддзя. Нягледзячы на шматлікія звароты да міністэрстваў унутраных спраў і юстыцыі, службовыя асобы не далі згоды на сустрэчу з прадстаўнікамі МФПЧ і наведванне імі месцаў зняволення.

Былыя зняволеныя паведамлялі, што медыцынскія агляды адбываліся рэдка, што іх праводзілі недастаткова кваліфікаваныя медыцынскія работнікі і што вынікі аглядаў часта фабрыкавалі. Некаторыя з былых палітычных зняволеных паведамлялі, што з імі абыходзіліся горш, чым з забойцамі, прымянялі псіхалагічны ціск і часта змяшчалі ў камеру са злачынцамі, схільнымі да гвалтоўных паводзінаў. Яны таксама паведамлялі, што ўлады не тлумачылі і не захоўвалі іх правоў паводле закона.

Сур’ёзнай была праблема перанаселенасці турмаў, следчых ізалятараў і ўстаноў адкрытага тыпу (для адбывання так званай “хіміі”). Асуджаныя на “хімію” (кшталт высылкі ў межах краіны) жылі ў турэмных бараках і былі абавязаныя працаваць паводле строгіх умоў. 22 красавіка семярых асудзілі на два гады “хіміі” і дваіх на выплату штрафаў у памеры 3,5 мільёна беларускіх рублёў (каля 1 640 даляраў) за ўдзел у дэманстрацыі, арганізаванай 10 студзеня прадстаўнікамі малога бізнэсу.

Паводле закона, сям’я і сябры маюць права прыносіць затрыманым ежу, сродкі гігіены і дасылаць паштовыя пасылкі зняволеным, але ў многіх выпадках улады не паважалі гэтыя палажэнні.

**BELARUS**

Паводле афіцыйных дадзеных, у 2007 годзе ў краіне было 30 000 зняволеных, а таксама каля 8 000 асуджаных на адбыванне пакарання ў альтэрнатыўных папраўчых установах і 7 000 чалавек у следчых ізалятарах. Зняволеныя, што скардзіліся на парушэнні сваіх правоў, часта сутыкаліся з прыніжэннямі, пагрозамі смерці, а таксама іншымі формамі пакарання. Некаторыя паведамлялі, што іх шантажуюць. Крыніцы сцвярджалі, што лёс петыцый пра датэрміновае вызваленне часта залежаў ад таго, ці дадзены хабар персаналу турмы. Звычайна памер хабару вагаўся паміж 430 000 ды 646 000 беларускіх рублёў (200 і 300 доларамі), але больш вядомых зняволеных часта прасілі заплаціць больш.

На працягу года не было паведамленняў пра незалежную ацэнку ўмоваў зняволення нацыянальнымі ці міжнароднымі праваабарончымі арганізацыямі, незалежнымі сродкамі масавай інфармацыі ці Міжнародным камітэтам Чырвонага Крыжа. Аднак часам улады давалі замежным дыпламатам магчымасць наведаць палітычных і іншых зняволеных у прысутнасці службовых асобаў пенітэнцыярнай установы.

г) адвольнага арышту і затрымання

Закон абмяжоўвае адвольныя затрыманні, аднак на практыцы ўлады не зважалі на гэтыя абмежаванні. Улады па-ранейшаму арыштоўвалі людзей па палітычных матывах і выкарыстоўвалі адміністрацыйныя захады для затрымання палітычных актывістаў да пачатку, падчас і пасля акцый пратэсту.

Роля міліцыі і сілавых ведамстваў

Міліцыя ёсць падпарадкаванай Міністэрству ўнутраных спраў, аднак КДБ і Служба бяспекі прэзідэнта таксама выконвалі функцыі міліцыі. Прэзідэнт мае права падпарадкоўваць сабе асабіста ўсе сілавыя структуры. Сярод міліцыянтаў была шырока распаўсюджаная дробная карупцыя. У перыяд са студзеня па травень колькасць злачынстваў, звязаных з карупцыяй, вырасла на 15,5 адсоткаў, а колькасць выпадкаў хабару, як паведамлялася, вырасла з 470 да 501. Сур’ёзнай праблемай заставалася беспакаранасць. Нягледзячы на тое, што грамадзяне маюць права паведамляць у пракуратуру пра парушэнні з боку міліцыі, улады часта не расследавалі злоўжыванні сілавых структур і не прыцягвалі парушальнікаў да адказнасці.

Арышты і затрыманні

Міліцыянты часта арыштоўвалі і затрымлівалі асобаў, не маючы ордэра. Паводле закона, каб затрымаць чалавека больш як на тры

гадзіны, міліцыя павінна звярнуцца ў пракуратуру па дазвол. Аднак на практыцы гэтыя працэдуры звычайна былі фармальнасцю. Закон дазваляе міліцыі ўтрымліваць пад вартай асобу, што падазраецца ў здзяйсненні злачынства, на тэрмін да 10 сутак без высоўвання афіцыйных абвінавачанняў і на тэрмін да 18 месяцаў пасля іх высоўвання. Закон дазваляе пракурорам і следчым працягваць тэрміны ўтрымання пад вартай без атрымання дазволу суддзі. Затрыманыя маюць права аспрэчваць у судзе законнасць свайго ўтрымання пад вартай, аднак на практыцы звароты падазраваных у суд па перагляд рашэння аб затрыманні часта ігнаравалі, падазраваных прымушалі адмаўляцца ад зваротаў у суд.

Міліцыянты часта затрымлівалі людзей на некалькі гадзін нібыта з мэтай высвятлення асобы. Гэтую тактыку часта выкарыстоўвалі для затрымання сябраў апазіцыі і дэманстрантаў, для прадухілення распаўсюду ўлётак і газет або як падставу для спынення сустрэч, арганізаваных грамадзянскай супольнасцю.

На працягу года шматлікіх асобаў, у тым ліку дзеячоў апазіцыі ды журналістаў незалежных СМІ, адвольна затрымлівалі і арыштоўвалі па матывах, шырока прызнаных як палітычныя.

27 сакавіка службоўцы КДБ затрымалі Паўла Левінава, праваабаронцу і юрыста Віцебскай арганізацыі Беларускага Хельсінкскага камітэта. 23 траўня ў Віцебску суд прыняў рашэнне ў адсутнасць Левінава арыштаваць яго на 10 дзён і аштрафаваць на 700 000 беларускіх рублёў (325 долараў) за непадпарадкаванне загаду і выкарыстанне нецэнзурнай лексікі.

З 7 па 10 ліпеня ўлады затрымалі больш як 15 актывістаў апазіцыі і праваабаронцаў у сувязі з выбухам, які адбыўся 4 ліпеня ў цэнтры Мінска і ў выніку якога пацярпелі 50 чалавек. Праз дзесяць дзён затрыманых выпусцілі на волю без прад’яўлення абвінавачанняў. Праваабарончае НДА “Вясна” выступіла з крытыкай затрыманняў і абвінаваціла КДБ у выкарыстанні інцыдэнту як нагоды для затрыманняў і допытаў актывістаў, а таксама для запалохвання іх родных. Міністэрства ўнутраных спраў адмаўлялася паведаміць агульную колькасць асобаў, затрыманых ці адпушчаных. Па стане на канец года, расследаванне абставін выбуху яшчэ працягвалася.

26 ліпеня міліцыянты і службоўцы КДБ затрымалі і адпусцілі прыкладна 50 моладзевых актывістаў за парушэнне заканадаўства ў сферы аховы навакольнага асяроддзя, калі тыя паставілі намёты каля возера ў Барысаўскім раёне. Маладыя людзі прымалі ўдзел у працы трохдзённага летніка, арганізаванага кааліцыяй “Еўрапейская Беларусь”.

Улады падвяргалі асобаў кшталту хатняга арышту. 27 траўня актывістам Паўлу Вінаградаву і Міхаілу Субачу прызначылі пакаранне ў выглядзе "абмежавання волі" на два гады за ўдзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, што прайшла ў Мінску 10 студзеня. Яшчэ адной асобе, непаўнагадоваму Максіму Дашуку, прызначылі 18-месячны тэрмін.

У 2006 годзе ўлады затрымалі ці арыштавалі каля 1000 чалавек па ўсёй краіне па палітычных прычынах напярэдадні і пасля прэзідэнцкіх выбараў, што прайшлі ў сакавіку. Многіх затрымлівалі і арыштоўвалі, калі яны неслі ежу і цёплае адзенне дэманстрантам, што праводзілі на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску акцыю пратэсту супраць сфальсіфікаваных выбараў.

Амністыя

На працягу першых пяці месяцаў года ўлады выпусцілі больш як 2 700 зняволеных у адпаведнасці з законам аб амністыі ад 2007 года. У адрозненне ад папярэдніх гадоў, новай агульнай амністыі не было.

д) адмова ў правядзенні справядлівага адкрытага суда

Канстытуцыя дэкларуе незалежнасць судовай сістэмы, аднак насамрэч улады не забяспечвалі незалежнасць судовай сістэмы. Шырокі распаўсюд мелі карупцыя, нізкая эфектыўнасць судовай сістэмы, а таксама палітычнае ўмяшальніцтва ў яе дзейнасць.

Паступалі сведчанні пра тое, што пракуроры абвінавачвалі, а суды асуджалі асобаў па сфабрыкаваных і палітычна матываваных абвінавачаннях, і што выканаўчая і мясцовыя ўлады дыктавалі вынікі судовых разбіральніцтваў.

Сістэма крымінальнага правасуддзя мае тры ступені: раённыя суды, абласныя суды і Вярхоўны суд. Канстытуцыйны суд надзелены паўнамоцтвамі выносіць рашэнні па канстытуцыйных пытаннях і вызначаць адпаведнасць законаў канстытуцыйным нормам, аднак на практыцы ён залежаў ад выканаўчай улады.

Прэзідэнт прызначае шасцярых з 12 сябраў Канстытуцыйнага суда, у тым ліку яго старшыню, а таксама старшыняў Вярхоўнага суда і Вышэйшага гаспадарчага суда. Акрамя таго, ён мае права прызначаць і здымаць усіх раённых ды ваенных суддзяў. Забеспячэнне суддзяў жыллём было функцыяй службовых асобаў выканаўчай улады.

**BELARUS**

Дзейнасць пракуратур арганізаваная на раённым, абласным і рэспубліканскім узроўнях. Пракуроры падпарадкаваныя Генеральнаму пракурору, якога прызначае прэзідэнт, і выконваюць любую яго волю. Пракуроры не дзейнічаюць самастойна і не маюць паўнамоцтваў высоўваць абвінавачанні супраць прэзідэнта альбо сябраў яго адміністрацыі.

У 2006 годзе Спецыяльны дакладчык ААН па Беларусі ахарактарызаваў паўнамоцтвы пракурораў як "празмерныя і незбалансаваныя" з-за таго, што пракуроры магуць працягваць тэрмін утрымання асобы пад вартай без дазволу суддзі. У справаздачы таксама адзначалася адсутнасць раўнавагі паміж паўнамоцтвамі пракуратуры і абароны. Адвакаты не маюць магчымасці знаёміцца з матэрыяламі следства, прысутнічаць падчас следчых мерапрыемстваў, вывучаць доказы, сабраныя супраць падабаронных да таго часу, пакуль пракурор афіцыйна не перадасць справу ў суд. Адвакатам было цяжка аспрэчваць некаторыя доказы, паколькі тэхнічная экспертыза кантралявалася пракуратурай. Паводле сведчанняў многіх адвакатаў, гэтая неадпаведнасць паўнамоцтваў узмацнілася ў пачатку года, асабліва ў адносінах да палітычна матываваных крымінальных і адміністрацыйных спраў. Колькасць выпадкаў, калі асобаў, супраць якіх былі высунутыя крымінальныя абвінавачанні, прызнавалі невінаватымі, была надзвычай малой.

У адпаведнасці з дэкрэтам прэзідэнта, усе адвакаты падпарадкоўваюцца Міністэрству юстыцыі. Адвакаты павінны атрымліваць ліцэнзію Міністэрства юстыцыі і належаць да дзяржаўнай калегіі свайго рэгіёна, і ліцэнзію неабходна аднаўляць кожныя пяць гадоў. Закон забараняе прыватную адвакацкую практыку. У адрозненне ад папярэдніх гадоў, не паступала звестак пра афіцыйнае пазбаўленне адвакатаў ліцэнзій за абарону НДА ці апазіцыйных палітычных партый.

Судовыя працэдуры

Закон прадугледжвае прэзумпцыю невінаватасці, тым не менш, на практыцы абвінавачаныя часта мусілі даказваць сваю невінаватасць. Закон таксама прадугледжвае правядзенне адкрытых судовых паседжанняў, аднак часам суды былі закрытыя і часта праводзіліся ў кабінетах суддзяў. Судовыя рашэнні выносяць суддзі. Інстытуту прысяжных няма. Аднак пры разглядзе справаў па фактах цяжкіх злачынстваў суддзі выносяць рашэнні з дапамогай двух грамадзянскіх дарадцаў.

Падсудныя маюць права прысутнічаць на судовых пасяджэннях, задаваць пытанні сведкам і прадстаўляць доказы ад свайго імя, аднак па практыцы гэтыя правы не заўсёды забяспечваліся.

15 траўня суд прыняў завочнае рашэнне прызначыць лідэрам Маладога фронту Артуру Фінькевічу і Змітру Дашкевічу пакаранне ў выглядзе арышту на тэрмін 7 дзён за ўдзел у дэманстрацыі 1 траўня. Паведамленні пра судовае рашэнне яны атрымалі 19 траўня.

23 траўня лідэру Маладога фронту Змітру Федаруку паведамілі, што за два тыдні да таго было вынесенае завочнае рашэнне прызначыць яму пакаранне ў выглядзе арышту на 10 дзён і штрафу ў памеры 1 050 000 беларускіх рублёў (490 даляраў) за ўдзел у дэманстрацыі 1 траўня і непадпарадкаванне міліцыі. Паведамленне даставілі пасля таго, як скончыўся 10-дзённы тэрмін, вызначаны законам для абскарджвання рашэння.

Закон прадугледжвае доступ затрыманых да юрыдычнай дапамогі і патрабуе, каб суд прызначаў абаронцаў для тых, хто не можа сабе гэтага дазволіць, аднак час ад часу гэтыя правы не захоўваліся, і некаторым затрыманым адмаўлялі ў доступе да адваката. У законе замацаваная свабода выбару юрыдычнага прадстаўніка, аднак прэзідэнцкі дэкрэт забараняе сябрам НДА прадстаўляць у судзе тых, хто не ўваходзіць у арганізацыю.

Суды часта дазвалялі выкарыстоўваць супраць падсудных інфармацыю, здабытую падчас допытаў з выкарыстаннем прымусу.

Падсудныя маюць права аспрэчваць рашэнні суда, і большасць падсудных па крымінальных справах падавалі апеляцыі. Падчас разгляду апеляцый рэдка прысутнічалі абвінавачаныя ці сведкі; у большасці выпадкаў суды разглядалі толькі пратаколы ды іншыя матэрыялы спраў судоў ніжэйшай інстанцыі. У пераважнай большасці выпадкаў суды вышэйшай інстанцыі пакідалі нязменнымі прысуды, вынесеныя судамі ніжэйшай інстанцыі.

### Зняволеныя і затрыманыя па палітычных матывах

На працягу года ўлады выпусцілі з месцаў зняволення дзевяцярых міжнародна прызнаных палітычных зняволеных. Аднак улады па-ранейшаму рабілі захады супраць былых зняволеных і затрыманых па палітычных матывах, затрымлівалі іх і арыштоўвалі на кароткія тэрміны.

У студзені і лютым улады выпусцілі пяцярых палітычных зняволеных: Змітра Дашкевіча, Юрыя Лявонава, Мікалая Аўтуховіча, Артура Фінькевіча і Андрэя Клімава. Дашкевіч, моладзевы лідэр,

адбыў 16 месяцаў 18-месячнага тэрміну пазбаўлення волі за кіраванне дзейнасцю незарэгістраванай арганізацыі. У 2006 годзе Лявонава і Аўтуховіча, якія ўзначальвалі незалежнае аб’яднанне ўладальнікаў малога бізнэсу, прыгаварылі да пазбаўлення волі на тры гады нібыта за незаконную дзейнасць і ўхіленне ад выплаты падаткаў. Фінькевіч, моладзевы актывіст, правёў у зняволенні больш як два гады за палітычныя графіці. Клімаў, сябра аб’яднанай грамадзянскай партыі, быў зняволены ў красавіку 2007 года за размяшчэнне антыўрадавага артыкулу на вэбсайце сваёй партыі.

22 лютага палітычны зняволены Аляксандр Здвіжкоў выйшаў на волю, адбыўшы тры месяцы свайго трохгадовага тэрміну. У студзені былога рэдактара незалежнага штотыднёвага выдання “Згода” асудзілі за перадрук у адным з нумароў газеты за 2006 год спрэчных дацкіх карытатур на прарока Мухамада.

16 жніўня ўлады выпусцілі палітычнага зняволенага і былога кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна. Ён правёў у зняволенні больш як два гады з пяці з паловай гадоў, прадугледжаных прысудам. Яго паплечнікі сцвярждалі, што ён не атрымаў здавальняючай медыцынскай дапамогі, пасля таго як быў збіты міліцыяй падчас арышту ў 2006 годзе, а таксама ў 2007 годзе пасля 53-дзённай галадоўкі, якую праводзіў на знак пратэсту супраць свайго зняволення і сфальсіфікаваных прэзідэнцкіх выбараў 2006 года.

20 жніўня выйшлі на волю моладзевы актывіст Андрэй Кім і прадпрымальнік Сяргей Парсюкевіч – апошнія двое палітычных зняволеных. Кіма арыштавалі ў студзені і пазней прыгаварылі да пазбаўлення волі на тэрмін 18 месяцаў нібыта за пагрозу на адрас міліцыянта падчас дэманстрацыі. Парсюкевіча зняволілі ў красавіку нібыта за парушэнне новых патрабаванняў да прадпрымальніцкай дзейнасці і напад на міліцыянта ў пастарунку.

У іншых выпадках улады адмаўлялі ў амністыі актывістам, што адбывалі пакаранне пад хатнім арыштам па абвінавачаннях, шырока прызнаных як палітычна матываваныя.

### Грамадзянскія судовыя працэсы і кампенсацыя шкоды

Асобы могуць падаваць судовыя зыскі, патрабуючы кампенсаваць шкоду, нанесеную ў выніку парушэння правоў чалавека, ці спыніць парушэнне, але грамадзянская судовая сістэма не ёсць незалежнай і рэдка праяўляе аб’ектыўнасць у такіх пытаннях.

е) адвольнага ўмяшальніцтва ў прыватнае і сямейнае жыццё, парушэння недатыкальнасці жылля ці тайны ліставання

Закон забараняе такія дзеянні, аднак на практыцы ўрад не зважаў на гэтыя забароны. Закон прадугледжвае адміністрацыйныя санкцыі і крымінальны пераслед у дачыненні да тых, хто перашкаджае супрацоўнікам КДБ выконваць свае абавязкі, нават калі іх дзеянні могуць быць па сутнасці незаконнымі. Перашкодай лічыцца любая спроба прадухіліць уваход супрацоўнікаў КДБ Беларусі ў памяшканне кампаніі, установы ці арганізацыі, як і любое процідзеянне правядзенню КДБ Беларусі праверак ці адмова забяспечыць доступ да інфармацыйных сістэм і базаў дадзеных кампаніі або спроба нейкім чынам абмежаваць доступ.

Паводле закона,ператрус праводзіцца пры наяўнасці ордэра, аднак супрацоўнікі КДБ Беларусі без ордэраў пранікалі ў дамы, праводзілі несанкцыянаваныя ператрусы і чыталі карэспандэнцыю. КДБ мае паўнамоцтвы ўваходзіць у любы будынак у любы час у тым выпадку, калі звернецца па ордэр на працягу 24 гадзін пасля ўваходу. Паводле вартых даверу звестак, супрацоўнікі ведамстваў дзяржаўнай бяспекі тайна пранікалі ў кватэры актывістаў апазіцыі ды офісы апазіцыйных груп і адсочвалі дзейнасць асобаў.

У шматлікіх выпадках улады праводзілі ператрусы жылля і офісаў па выразна палітычных прычынах. Напрыклад, 12 студзеня службоўцы КДБ увайшлі ў кватэру незалежнага журналіста Сяргея Падсасоннага і канфіскавалі кампутарную тэхніку ды відэакамеру нібыта ў сувязі з расследаваннем яго дачынення да моладзевага апазіцыйнанага аб’яднання “Малады фронт”.

16 чэрвеня ў Дзяржынску міліцыя правяла ператрус дома ў актывісткі апазіцыі Таццяны Ванінай. Службоўцы паказалі ордэр на ператрус датаваны 19 траўня, у якім сцвярджалася, што Ваніна займаецца вытворчасцю нелегальных друкаваных матэрыялаў.

7 жніўня сілы міліцыя спецыяльнага прызначэння і супрацоўнікі КДБ выбілі дзверы ў штабкватэры Маладога фронту і затрымалі семярых моладзевых актывістаў. Службоўцы не паказалі ордэр на ператрус і паведамілі, што ўвайшлі ў кватэру на падставе ананімнага паведамлення пра тое, што там знаходзіцца труп. Былых лідэраў Маладога фронту Зміцера Дашкевіча і Артура Фінькевіча пакаралі арыштам на сем дзён. Яшчэ аднаго актывіста, Паўла Кур’яновіча, арыштавалі на 15 дзён.

19 лістапада ўлады правялі ператрус у офісе руху “За Свабоду”. Паводле слоў лідэра руху Аляксандра Мілінкевіча, судовыя выканаўцы правялі інвентарызацыю ўсёй уласнасці ў кватэры на той

падставе, што за дзесяць гадоў да таго ў кватэры жыў чалавек, які праходзіў па крымінальнай справе.

Закон забараняе ўладам перахопліваць тэлефонныя размовы і іншую інфармацыю, што перадаецца па каналах сувязі, без пастановы суда. На практыцы ўлады вялі назіранне за жыллём, адсочвалі абмен інфармацыяй па тэлефоне і праз камп'ютары. Практычна ўсе апазіцыйныя палітыкі паведамлялі, што ўлады адсочваюць іх дзеянні і перамовы.

КДБ Беларусі, міністэрства ўнутраных спраў і некаторыя падраздзяленні памежных войскаў могуць выкарыстоўваць прылады для праслухоўвання, але абавязаныя спачатку атрымаць санкцыю пракурора. Аднак пракуратура не ёсць незалежнай, што пазбаўляла сэнсу працэсуальныя патрабаванні.

Урад валодаў кантрольнымі пакетамі акцый усіх кампаній сотавай сувязі акрамя дзвюх. Дамовы аб тэлефонных паслугах з Міністэрствам сувязі забаранялі абанентам выкарыстоўваць тэлефонную сувязь з мэтамі, якія супярэчаць інтарэсам дзяржавы і грамадскага парадку. Міністэрства сувязі мае права спыніць аказанне тэлефонных паслуг тым, хто парушае закон.

Паступалі шматлікія звесткі пра тое, што ўлады прымушаюць маладых людзей, студэнтаў універсітэтаў і прызыўнікоў ўступаць у фінансаваную дзяржавай НДА "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі" (БРСМ), што падтрымлівае Лукашэнку. Акрамя таго, урад наймаў і падтрымліваў шырока распаўсюджаную сістэму інфарматараў БРСМ, арганізаваных у патрулі грамадскага кантролю, афіцыйнай мэтай якіх было выхаванне студэнтаў як законапаслухмяных грамадзян. У пачатку 2007 года існавала 3 633 грамадскія патрулі, у якія ўваходзілі да 43 000 чалавек. Было створана амаль 200 "добраахвотніцкіх" патрулёў, 49 з якіх займаліся забеспячэннем парадку ў вышэйшых навучальных установах, 77 працавалі ў сярэдніх школах і 66 у прафесійна-тэхнічных вучэльнях.

Вучні старэйшых класаў баяліся, што іх не залічаць ва ўніверсітэты, калі яны не будуць сябрамі БРСМ, а студэнты ўніверсітэтаў паведамлялі, што пацверджанне сяброўства ў БРСМ часта патрабавалася для таго, каб патрапіць на папулярны курс ці атрымаць пакой у інтэрнаце. Універсітэты таксама прапаноўвалі ўдзельнікам патрулёў зніжкі на навучанне. 11 студзеня міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў абвясціў, што сяброўства ў БРСМ будзе ўлічана пры выдачы новых рэкамендацый, абавязковых для студэнтаў, якія жадаюць навучацца па спецыяльнасцях, звязаных з міжнароднымі адносінамі, дзяржаўным кіраваннем і журналістыкай.

Таксама паступалі сведчанні пра тое, што за меркаваныя парушэнні ці апазіцыйную дзейнасць грамадзян улады пагражалі пакараннем іх родным. Напрыклад, у чэрвені жонку Гомельскага лідэра Аб’яднанай грамадзянскай партыі Васіля Палякова, настаўніцу гісторыі, звольнілі з працы. Адміністрацыя школы назвала яе дзейнасць неадпаведнай “дзяржаўнай палітыцы” і абвясціла, што з ёй не будзе падоўжаны кантракт. Пасля выбуху, што адбыўся ў Мінску 4 ліпеня, супрацоўнікі КДБ дапыталі Алену Каваленка, жонку сябра Беларускага народнага фронту Сяргея Каваленкі, і паведамілі, што за ёй сочаць.

Раздзел 2. Захаванне грамадзянскіх свабодаў, у тым ліку:

a) свабоды слова і друку

Кантытуцыя дэкларуе свабоду слова і друку, аднак на практыцы ўрад не захоўваў гэтыя правы і прымяняў шматлікія законы, каб кантраляваць і цэнзураваць СМІ.

Асобы не мелі магчымасці публічна крытыкаваць урад, на баючыся пераследу. Улады запісвалі на відэа палітычныя акцыі, часта правяралі пасведчанні асобы, а таксама выкарыстоўвалі іншыя формы запалохвання. Забаронена таксама нашэнне масак і выкарыстанне незарэгістраваных сцягоў, сімвалаў і плакатаў са зместам, які можа быць расцэнены як пагроза ўраду ці грамадскаму парадку.

Закон таксама абмяжоўвае свабоду слова, прадугледжваючы крымінальную адказнасць за перадачу замежнаму грамадзяніну інфармацыі пра палітычнае, эканамічнае, сацыяльнае ці ваеннае ці міжнароднае становішча краіны, калі інфармацыя, па меркаванні ўладаў, ёсць ілжывай ці зняважлівай.

4 жніўня Лукашэнка падпісаў новы закон пра СМІ, які дазволіць уладам яшчэ больш абмежаваць свабоду прэсы. Паводле закона, які пачынае дзейнічаць з лютага 2009 года, праца Інтэрнэт-СМІ рэгулюецца тымі ж палажэннямі, што друкаваныя і электронныя СМІ, большасць з тых СМІ, што ўжо існуюць, падлягаюць перарэгістрацыі, журналісты павінны атрымліваць акрэдытацыю, а падтрымка з боку замежных арганізацый не павінна перавышаць 30 адсоткаў. З крытыкай закона выступілі шматлікія нацыянальныя і міжнародныя НДА, абаронцы правоў прэсы, сярод іх Камітэт абароны журналістаў, “Артыкул IX”, Беларуская асацыяцыя журналістаў і Грамадзянская Беларусь.

**BELARUS**

Выходзілі незалежныя газеты і часопісы, працавалі сайты навінаў у Інтэрнэце. Аднак яны дзейнічалі ў абмежавальных умовах заканадаўства ў сферы СМІ, і большасць сутыкалася з дыскрымінацыйным стаўленнем выдаўцоў і распаўсюднікаў.

СМІ, якія знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы, пераважалі на інфармацыйным полі і мелі самыя высокія наклады і аўдыторыі. Дзяржаўная паштовая сістэма "Белпошта" і дзяржаўная сістэма кіёскаў "Белсаюздрук" па-ранейшаму адмаўляліся дастаўляць і прадаваць больш як тузін незалежных газет. У 2007 годзе "Белпошта" выдаліла тры папулярныя расейскія газеты – "Коммерсант", "Московский комсомолец» і «Независимая газета» - са свайго падпіснога каталога. Аднак іншыя расейскія газеты, у тым ліку "Известия", засталіся ў распаўсюдзе. Паводле аналітыкаў медыйнай прасторы, газеты выдалілі з падпіскі з-за іх крытычнага асвятлення палітыкі прэзідэнта Лукашэнкі.

25 лістапада незалежныя газеты "Народная Воля" і "Наша Ніва" падпісалі дамовы на распаўсюд праз дзяржаўную сістэму распаўсюду пасля трохгадовай забароны з боку ўладаў. "Народная воля" таксама атрымала згоду ўладаў на сваё друкаванне ў Мінску ў дзяржаўнай друкарні. Раней газету друкавалі ў расейскім Смаленску з-за ціску з боку ўладаў. Аднак нягледзячы на тое, што абедзьве газеты з'явіліся ў продажы, яны па-ранейшаму сутыкаліся з абмежаваннямі.

Мясцовыя ўлады часта папярэджвалі незалежных рэдактараў і журналістаў, каб тыя пазбягалі асвятлення пэўных тэмаў і крытыкі на адрас ўладаў. Улады таксама папярэджвалі бізнэсоўцаў, каб тыя не размяшчалі рэкламу ў выданнях, што крытыкуюць урад.

Міжнародныя сродкі  масавай інфармацыі працягвалі сваю працу ў краіне, але не абыходзілася без умяшальніцтва і пераследу. "Еўраньюс" і расейскія каналы "ТВ-Цэнтр", "НТВ" і "РТР" пераважна былі даступнымі, хаця ў многіх рэгіёнах краіны выключна праз платныя кабельныя каналы. Іх інфармацыйныя праграмы часам блакавалі ці замянялі мясцовымі праграмамі. Трансляцыі з іншых краін, у тым ліку з Польшчы і Літвы, можна было прымаць у некаторых частках краіны, звычайна ўздоўж мяжы.

Урад па-ранейшаму пераследаваў і арыштоўваў журналістаў.

12 студзеня КДБ і міліцыянты затрымалі незалежных журналістаў Уладзіміра Самойлава, Галіну Самойлаву і аператара Валера Булдыка. Міліцыя дапытала іх пра супрацу з незалежнай спутнікавай тэлекампаніяй "Белсат", што месціцца ў Варшаве, і

канфіскавала іх абсталяванне на падставе таго, што яно магло быць скрадзеным.

27 і 28 сакавіка ўлады правяліператрусы ў дамах і офісах каля 30 журналістаў у 12 гарадах. Паводле БАЖ, службоўцы КДБ затрымалі 16 журналістаў і канфіскавалі кампутары, аўдыё- і відэатэхніку, а таксама друкаваныя матэрыялы. Гэтыя скаардынаваныя захады былі зробленыя пасля жорсткага разгону ў Мінску 25 сакавіка мірнага шэсця "Дзень Волі". Намеснік пракурора Мінска Аляксей Стук паведаміў, што ён санкцыянаваў ператрусы і канфіскацыі ў сувязі з шырокім асвятленнем журналістамі шэсця і яго жорсткага разгону міліцыяй.

Некаторым замежным журналістам не дазвалялі асвятляць падзеі ў краіне. Напрыклад, 28 траўня, Міністэрства замежных спраў паведаміла Аляксею Мінчонку, карэспандэнту незалежнай польскай радыёстанцыі "Радыё Рацыя", што яго не акрэдытуюць, бо ён "раней незаконна працаваў на замежныя СМІ без акрэдытацыі".

Урад цэнзураваў сродкі масавай інфармацыі. Улады часта спаганялі велізарныя штрафы з журналістаў і рэдактараў за крытыку прэзідэнта і ягоных паплечнікаў. Многія выданні былі вымушаныя практыкаваць самацэнзуру. Улады каралі штрафамі, папярэджвалі і пазбаўлялі волі прадстаўнікоў СМІ, што публічна крытыкавалі ўрад.

Урад жорстка кантраляваў змест нацыянальнага вяшчання. У красавіку 2007 года прэзідэнт Лукашэнка абвясціў, што ўрад па-ранейшаму лічыць прыярытэтам захаванне дзяржаўнага кантролю над радыё- і тэлевізійнымі станцыямі і што прыватным станцыям не будзе дазволена працаваць у краіне. Ён таксама адзначыў, што дзяржаўныя друкарні ніколі не падпішуць дамоваў з тымі незалежнымі выданнямі, якія парушаюць заканадаўства ў сферы СМІ.

Права на вяшчанне на ўсёй тэрыторыі краіны мелі толькі дзяржаўнае радыё і дзяржаўныя тэлевізійныя каналы "АНТ", "Першы нацыянальны канал" і "Сталічнае тэлебачанне". Урад па-ранейшаму карыстаўся сваёй ледзь не манаполіяй на тэлевяшчанне, каб распаўсюдзіць сваё бачанне падзей і мінімізаваць асвятленне альтэрнатыўных пунктаў гледжання. Дзяржаўнае тэлебачанне ўзгадняла свае прапагандысцкія стужкі са спецслужбамі краіны. Напрыклад, "Першы нацыянальны канал" часта выдаваў у эфір відэаматэрыялы, адснятыя супрацоўнікамі спецслужб падчас сустрэч паміж актывістамі апазіцыі і прадстаўнікамі міжнародных арганізацый ці замежнымі дыпламатамі.

**BELARUS**

У некаторых рэгіёнах працавалі мясцовыя незалежныя тэлевізійныя студыі, што перадавалі мясцовыя навіны і былі адносна больш вольныя ад умяшальніцтва з боку ўладаў, аднак бальшыню улады прымушалі ці пазбягаць асвятлення пытанняў нацыянальнага ўзроўню, ці падлягаць цэнзуры. Такія студыі часта вымушалі перадаваць свае матэрыялы ўладам і супрацоўнічаць з імі, каб запалохаць мясцовую апазіцыю і праваабаронцаў, якія сустракаліся з замежнымі дыпламатамі.

Паводле заканадаўства, улады могуць закрыць выданне пасля двух папярэджанняў, атрыманых ім на працягу аднаго года за парушэнні шэрагу абмежаванняў свабоды слова і прэсы. Да таго ж, палажэнні закона даюць уладам магчымасць адвольна забараняць або цэнзураваць публікацыі. Дзяржаўны камітэт па друку можа прыпыняць выданне перыёдыкі і газет на тры месяцы без пастановы суда. Закон таксама забараняе СМІ распаўсюджваць інфармацыю ад імя незарэгістраваных палітычных партый, прафсаюзаў і НДА.

16 траўня Мінскія гарадскія ўлады аддалі загад прыватнай кампаніі “Космас ТВ”, што прапануе паслугі кабельнага тэлебачання, тэрмінова спыніць трансляцыю трох расейскіх каналаў. Два з трох гэтых каналаў выпусцілі ў эфір забароненую дакументальную стужку пра Лукашэнку.

Паводле закона, паклёп ёсць крымінальным злачынствам. Абраза гонару і годнасці прэзідэнта і дзяржаўных службовых асобаў караюцца вялікімі штрафамі і пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў. Палажэнні аб паклёпе не робяць адрозненняў у залежнасці ад таго, у адносінах да прыватнай ці публічнай асобы распаўсюджваюцца зневажальныя звесткі. Публічная асоба, якую пакрытыкавалі СМІ за дрэннае выкананне службовых абавязкаў, можа падаць зыск і супраць журналіста, і супраць сродка масавай інфармацыі, які распаўсюдзіў крытычны матэрыял.

У кастрычніку 2007 года незалежную газету “Народная Воля” і аднаго з яе штатных карэспандэнтаў аштрафавалі на 25 мільёнаў беларускіх рублёў (11 600 даляраў) і два мільёны беларускіх рублёў (940 даляраў) адпаведна нібыта за дыскрэдытацыю кіраўніка прэзідэнцкага ідэалагічнага ўпраўлення. У снежні 2007 года газеце “Новы час” і яе штатнаму карэспандэнту загадалі заплаціць 50 мільёнаў беларускіх рублёў (23 200 даляраў) і адзін мільён беларускіх рублёў (465 даляраў) адпаведна сябру Нацыяльнага сходу за аналітычны артыкул пра ролю заканатворцы ў крымінальнай справе савецкага часу і ў падкантрольным дзяржаве саюзе пісьменнікаў. Газеты выплацілі штрафы і аднавілі свой выхад.

**BELARUS**

На працягу года ўрад рабіў шматлікія іншыя захады, каб абмежаваць дзейнасць незалежнай прэсы, у тым ліку праз абмежаванне доступу да газетнай паперы і друкарняў. Некалькі незалежных газет, у тым ліку "Віцебскі кур'ер М", друкавалі свае матэрыялы ў Расеі, таму што беларускія друкарні, якія пераважна належаць дзяржаве, адмовіліся іх друкаваць. Іншыя незалежныя газеты, напрыклад, "Салідарнасць", распаўсюджваліся толькі ў Інтэрнэт-версіях з-за складанасцяў з друкаваннем і распаўсюдам.

25 красавіка міліцыя канфіскавала сотні экзэмпляраў незалежнай газеты "Віцебскі кур'ер М" у актывіста апазіцыі і распаўсюдніка Валера Шчукіна, калі ён прыехаў з расейскага Смаленску, дзе друкавалася газета. Шчуктна абвінавацілі ў парушэнні палажэнняў аб распаўсюдзе газет. 20 траўня суд Ушачаў аштрафаваў сябраў Маладога фронту з Полацку Кацярыну Салаўёву і Алеся Круткіна на 1 050 000 рублёў (490 даляраў) кожнага за распаўсюд незаконных друкаваных выданняў. 10 ліпеня міліцыя затрымала Барыса Хамайду за продаж незалежных газет у Мінску. Пазней невядомы збіў Хамайду. Міліцыя абвінаваціла Хамайду ў выкарыстанні нецэнзурнай лексікі на адрас нападаўцы і пакінула яго ў пастунку на тры дні.

У траўні ўлады загадалі Гарадзенскай незалежнай газеце "Газета Слонімская" вызваліць да 1 чэрвеня памяшканні, якія яна арандавала ў дзяржаўнага прадпрыемства. Паводле рэдактара газеты Віктара Валадашчука, ён не здолеў узяць у арэнду іншы офіс, бо агенцыі нерухомасці баяліся пакарання з боку ўладаў. Па стане на канец года, журналісты па-ранейшаму працавалі дома.

18 чэрвеня Міністэрства інфармацыі зрабіла папярэджанне "Віцебскаму кур'еру М" за парушэнне заканадаўства ў сферы СМІ праз публікацыю неправільнага адраса рэдакцыі і несвоечасовае паведамленне пра змену адраса. Месяцам раней Вышэйшы гаспадарчы суд зноў адмовіў газеце ў рэгістрацыі.

На працягу года адбываліся шматлікія канфіскацыі ўладамі незалежных і апазіцыйных газет, а таксама ўлётак і іншых матэрыялаў, якія лічыліся надрукаванымі незаконна.

Свабода Інтэрнэта

Урад абмяжоўваў доступ да Інтэрнэта, адсочваў электронную пошту і Інтэрнэт-форумы. Многія асобы і групы не мелі магчымасці мірна выказваць свае погляды праз Інтэрнэт, у тым ліку і праз электронную пошту.

Улады адсочваюць абмен дадзенымі ў Інтэрнэце без аніякіх перашкодаў. Уладальнікі Інтэрнэт-кафэ абавязаныя захоўваць

звесткі пра спажыўцоў сваіх паслуг і прадстаўляць іх дзяржаўным службам бяспекі. Паводле закона, "Белтэлеком" і іншыя арганізацыі, вызначаныя ўрадам, карыстаюцца эксклюзіўным правам падтрымліваць Інтэрнэт-дамэны.

Каля 30 адсоткаў насельніцтва, асабліва ў гарадах, мелі доступ да Інтэрнэта. Доступ быў абмежаваны адносна высокімі коштамі і недахопам прапановы хуткаснай сувязі. Часам дзяржаўныя правайдэры блакавалі незалежныя і апазіцыйныя вэбсайты падчас буйных палітычных падзей.

10 студзеня вэбсайты "Радыё Свабода", "Хартыя-97", "Беларускі партызан" і сайт Аб'яднанай грамадзянскай партыі былі заблакаваныя поўнасцю ці часткова з-за бягучага асвятлення імі дэманстрацый уладальнікаў малога бізнэсу, што адбываліся ў Мінску. Доступ да вэбсайтаў "Radio Liberty", "Радыё Свабода", і "Хартыя-97" быў перарваны зноў у красавіку напярэдадні шэсцяў ва ўгодкі Чарнобыльскай катастрофы.

4 жніўня Лукашэнка падпісаў новы закон, паводле якога патрабаванні да інфармацыйных Інтэрнэт-выданняў будуць такія ж, як да друкаваных, у тым ліку і патрабаванне рэгістрацыі. Закон, які пачынае дзейнічаць у лютым 2009 года, таксама дазволіць дзяржаве на законных падставах блакаваць любыя незарэгістраваныя вэбсайты незалежна ад іх паходжання.

У адказ на ўмяшальніцтва ўраду і абмежаванні Інтэрнэта многія апазіцыйныя групы і незалежныя выданні перайшлі на Інтэрнэт-дамэны, якія ўтрымліваюцца па-за межамі краіны. Паводле крыніц, нешматлікія незалежныя інфармацыйныя сайты з мясцовымі дамэнамі ".by" практыкавалі жорсткую самацэнзуру.

### Акадэмічная свабода і культурніцкія імпрэзы

Урад абмяжоўваў акадэмічную свабоду і культурніцкія імпрэзы. Навучальныя установы абавязаныя выкладаць курс афіцыйнай ідэалогіі, якая спалучае ў сабе захапленне дасягненнямі часоў Савецкага Саюза і краінай пад кіраўніцтвам Лукашэнкі. Выкарыстанне слова "акадэмічны" абмежавана; няўрадавым арганізацыям забаронена выкарыстоўваць слова "акадэмія" ў сваіх назвах.

На працягу года ўлады звальнялі настаўнікаў і даследчыкаў па палітычных матывах. Напрыклад, Уладзімір Савіцкі, дырэктар сярэдняй школы ў пасёлку Вежа, загадаў настаўнікам пад пагрозай звальнення далучыцца да руху "Белая Русь". Заявы на ўступленне падалі ўсе настаўнікі акрамя аднаго. Прымусовае далучэнне

выхаваценляў да руху "Белая Русь адбылося таксама ў дзіцячым садку гэтай вёскі і ў Гуцукаўскай сярэдняй школе.

У сакавіку Паўла Наздру, актывіста незарэгістраванай партыі "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя", звольнілі з працы ў Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце, што ў Гомельскай вобласці, нібыта за адсутнасць на працоўным месцы. Паводле Наздры, яго звольнілі за палітычную дзейнасць, і ён не парушаў умоваў працоўнага пагаднення, падпісанага з універсітэтам.

Абавязковыя для выкарыстання дзяржаўныя падручнікі прапаноўвалі надзвычай прапагандысцкую версію гісторыі і іншых прадметаў. Усе адукацыйныя ўстановы, у тым ліку прыватныя, лічацца палітычнымі, мусяць выконваць дзяржаўныя загады і не могуць узначальвацца сябрамі апазіцыі. Міністр адукацыі мае права прызначаць і здымаць кіраўнікоў прыватных установ адукацыі.

Перад моладзевай арганізацыяй БРСМ, што фінансуецца дзяржавай і падтрымлівае Лукашэнку, урад ставіў задачу забеспячэння ідэалагічнай чысціні ў студэнцкім асяроддзі. Паводле звестак, студэнтаў універсітэтаў прымушалі далучацца да БРСМ, абяцаючы ільготы і пакоі ў інтэрнатах. Мясцовыя ўлады таксама прымушалі сябраў БРСМ прымаць удзел у кампаніях праўладных кандыдатаў. Акрамя таго, улады часам прымушалі студэнтаў станавіцца інфарматарамі спецслужб.

Паводле дырэктывы міністэрства адукацыі, навучальныя ўстановы могуць адлічыць любога студэнта, які займаецца антыўрадавай ці несанкцыянаванай палітычнай дзейнасцю, і абавязаныя належным чынам ажыццяўляць ідэалагічную падрыхтоўку студэнтаў. На працягу года не менш як 10 студэнтаў былі адлічаныя па палітычна матываваных прычынах (у 2007 годзе былі адлічаныя 20 студэнтаў, а ў 2006 годзе – 100). Аднак адміністрацыі некаторых універсітэтаў па-ранейшаму спасылаліся на акадэмічную непасляховасць ці пропускі заняткаў як прычыны для адлічэння.

21 і 22 студзеня траіх студэнтаў-актывістаў – Таццяну Цішкевіч, Паўла Кур'яновіча і Зміцера Жалезнічэнку – адлічылі з розных вышэйшых адукацыйных установ. Цішкевіч спачатку адлічылі з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту за пропуск тэрміну аплаты за навучанне, але пазней афіцыйныя асобы абвясцілі, што яно было выкліканае "парушэннямі грамадскага парадку і маралі". Кур'яновіча адлічылі з Мінскага дзяржаўнага радыётэхнічнага каледжу за пропуск заняткаў па прычыне 20-дзённага арышту за ўдзел у акцыі пратэсту 16 студзеня. Жалезнічэнку, сябра апазіцыйнага Беларускага народнага фронту, адлічылі з Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэту нібыта за парушэнні

ўнутранага распарадку ўстановы і васьмідзённы арышт, пад якім ён апынуўся пасля свайго першага выключэння з універсітэту ў верасні 2007 года. У чэрвені Франака Вячорку, сябра Беларускага народнага фронту, і Івана Шылу, лідэра Маладога фронту, адлічылі з навучальных установаў за ўдзел у несанкцыянаваных апазіцыйных акцыях.

Урад таксама абмяжоўваў правядзенне культурніцкіх імпрэзаў. На працягу года ўрад па-ранейшаму вымушаў апазіцыйныя тэатральныя трупы працаваць на такіх пляцоўках як бары і прыватныя кватэры, а таксама перашкаджаў правядзенню неафіцыйных імпрэзаў, прысвечаных гістарычным падзеям.

У сакавіку Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага не падоўжыў працоўны кантракт з Ганнай Саламянскай, а з Тэатра беларускай арміі звольнілі Марыну Юрэвіч. Абедзьве акторкі прымалі ўдзел у турнэ Свабоднага тэатру, Мінскага падпольнага тэатральнага калектыва, па Злучаным Каралеўстве.

б) свабода мірных сходаў і асацыяцый

Свабода сходаў

Канстытуцыя дэкларуе свабоду мірных сходаў, аднак на практыцы ўлады жорстка абмяжоўвалі гэтае права.

Толькі палітычныя партыі, прафсаюзы або зарэгістраваныя арганізацыі могуць звяртацца па дазвол на правядзенне дэманстрацый з колькасцю ўдзельнікаў больш за тысячу чалавек. Закон прадугледжвае крымінальны пераслед за ўдзел у дзейнасці незарэгістраваных НДА, падрыхтоўку асобаў да ўдзелу ў дэманстрацыях, фінансаванне масавых дэманстрацый ці звароты па замежную падтрымку, якая “нясе шкоду” краіне. Парушэнні караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

Арганізатары павінны звярнуцца па дазвол на правядзенне дэманстрацыі, шэсця або мітынгу не менш як за 15 дзён да запланаванай падзеі, а службоўцы мусяць даць адказ не пазней як за 5 дзён да яе пачатку. Аднак найчасцей улады або не давалі дазволу апазіцыйным групам, або дазвалялі ім праводзіць дэманстрацыі ў месцах, аддаленых ад цэнтра горада.

Напрыклад, актывісты звярнуліся па дазвол на правядзенне штогадовых шэсцяў у цэнтры Мінску на Дзень Волі 25 сакавіка і ва ўгодкі Чарнобыльскай катастрофы 26 красавіка. Дэманстрантам не дазволілі сабрацца ў вядомым месцы ў цэнтры горада, замест таго даўшы дазвол на правядзенне дэманстрацыі ў аддаленым пустэльным

парку. Сябраў Партыі камуністаў беларускай таксама скіравалі ў той аддалены парк адзначаць 1 траўня.

30 ліпеня гарадскія ўлады Брэста не далі дазвол актывісту-праваабаронцы Раману Кісляку на правядзенне акцыі пратэсту супраць выкарыстання абвінавачанняў у дробным хуліганстве ў дачыненні да актывістаў.

Улады прымянялі запалохванне і пагрозы, каб прымусіць людзей адмовіцца ад удзелу ў дэманстрацыях, здымалі ўдзельнікаў на відэа і прызначалі велізарныя штрафы і суткі арышту за ўдзел у несанкцыянаваных дэманстрацыях. Міліцыя і супрацоўнікі іншых службаў бяспекі збівалі і затрымлівалі дэманстрантаў падчас і пасля несанкцыянаваных, але мірных дэманстрацыяў.

Міліцыя таксама выкарыстоўвала практыку прэвентыўных затрыманняў, каб перашкодзіць правядзенню акцый пратэсту. У некаторых выпадках улады падтрымлівалі і каардынавалі высілкі праўрадавых груп, скіраваныя на тое, каб перашкаджаць апазіцыйным дэманстрацыям.

21 сакавіка ў Гомелі чацвярых апазіцыйных актывістаў арыштавалі за распаўсюд улётак пра дэманстрацыі, якія павінны былі адбыцца ў Гомелі 23 сакавіка і ў Мінску 25 сакавіка. Маладыя людзі заставаліся ў пастарунку па працягу трох дзён, пасля чаго іх прызналі вінаватымі ў парушэнні правіл арганізацыі масавых мерапрыемстваў.

11 жніўня актывістку Маладога фронту Людмілу Атакулаву пакаралі 10-дзённым арыштам за ўдзел у несанкцыянаванай дэманстрацыі 10 жніўня каля расейскай амбасады ў Мінску. У 15-хвіліннай акцыі пратэсту прынялі ўдзел 15 маладых людзей; яшчэ траіх удзельнікаў акцыі затрымалі, але адпусцілі, не высунуўшы абвінавачанняў.

У сакавіку 2006 года да 12 000 чалавек збіраліся ў Мінску на цэнтральнай плошчы і каля яе на працягу пяці дзён, каб выказаць пратэст супраць сфальсіфікаваных вынікаў прэзідэнцкіх выбараў. Службы бяспекі выкарысталі сілу, каб выдаліць з плошчы імправізаваны намётавы гарадок, і арыштавалі каля 250 чалавек. Пасля арыштаў каля 7 000 чалавек зрабілі спробу сабрацца на плошчы, каб выказаць пратэст супраць гвалтоўнага разгону і адзначыць Дзень Волі. Міліцыя спецыяльнага прызначэння зноў выкарыстала сілу, каб не пусціць дэманстрантаў на плошчу і спыніць шэсце.

Свабода асацыяцый

**BELARUS**

Закон абвяшчае свабоду асацыяцый, аднак на практыцы улады жорстка абмяжоўвалі гэтае права.

Урад прымяняў законы і патрабаванні да рэгістрацыі, каб абмежаваць дзейнасць незалежных асацыяцый, якія маглі б быць мець крытычнае стаўленне да ўраду. Усе НДА, палітычныя партыі і прафсаюзы павінны праходзіць рэгістрацыю ў Міністэрстве юстыцыі. Рашэнні па ўсіх заяўках на рэгістрацыю прымае ўрадавая камісія. Насамрэч яе рашэнні залежалі ў асноўным ад палітычнай і ідэалагічнай адпаведнасці арганізацыі аўтарытарнай філасофіі ўладаў.

Працэдуры рэгістрацыі вымагалі пазначэння колькасці сябраў, іх імёнаў, а таксама наяўнасці юрыдычнага адраса арганізацыі ў будынку з нежылога фонду. Асобы са спіса сябраў безабаронныя перад магчымым пераследам. Адмова ўладаў здаваць у арэнду памяшканні незарэгістраваным арганізацыям і кошт арэнды ў прыватным сектары прымушалі бальшыню арганізацый парушаць патрабаванні аб размяшчэнні ў будынку з нежылога фонда. Гэта дазваляла ўладам пазбаўляць рэгістрацыі дзейныя арганізацыі і адмаўляць ім у перарэгістрацыі.

12 жніўня Вярхоўны суд пакінуў без зменаў другое рашэнне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў рэгістрацыі партыі "Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя" (БХД), спаслаўшыся на тэхнічныя недахопы ў дакументах аб'яднання, пададзеных на рэгістрацыю. Аб'яднанню адмовілі ў рэгістрацыі і ў снежні 2007 года за тое, што яно не здолела "растлумачыць сэнс хрысціянскіх прынцыпаў і каштоўнасцяў".

У кастрычніку 2007 года Вярхоўны суд не задаволіў скаргу НДА "Вясна", у якой аб'яднанне прасіла перагледзець рашэнне міністэрства юстыцыі аб адмове аб'яднанню ў рэгістрацыі. Паводле міністэрства, "Вясна" не выканала тэхнічныя патрабаванні занадаўства да дзейнасці НДА, а статут аб'яднання быў занадта размыты.

З 1997 года ўлады шэсць разоў адмаўлялі Маладому фронту ў рэгістрацыі, у тым ліку і на працягу апошняга года, калі аб'яднанне прасіла дазволу правесці сход заснавальнікаў на адной з Мінскіх плошчаў.

На працягу года Міністэрства юстыцыі зноў паведамляла пра вынясенне пісьмовых папярэджанняў НДА, палітычным партыям і прафсаюзам, а таксама пра тое, што суды працягваюць прыпыняць дзейнасць ці пазбаўляць рэгістрацыі НДА і палітычныя партыі за "сістэматычныя ці сур'ёзныя парушэнні закона". Па-ранейшаму

шырока практыкаваліся рэпрэсіўныя захады ў выглядзе інспекцый з боку спецслужбаў, якія звычайна праводзіліся без прад'яўлення ордэраў, і канфіскацыі палітычных выданняў.

c) свабода веравызнання

Закон гарантуе свабоду веравызнання, аднак на практыцы ўлады абмяжоўвалі гэтае права. Нягледзячы на тое, што канстытуцыя сцвярджае роўнасць рэлігій і канфесій, яна таксама ўтрымлівае абмежавальныя палажэнні, у адпаведнасці з якімі супрацоўніцтва паміж дзяржавай і рэлігійнымі арганізацыямі "рэгулюецца законам з улікам іх уплыву на фармаванне духоўных, культурных і нацыянальных традыцый беларускага народа".

Урад па-ранейшаму выкарыстоўваў абмежавальныя палажэнні рэлігійнага заканадаўства ад 2002 года для таго, каб ускладняць ці прадухіляць дзейнасць рэлігійных груп, якія не належаць да Беларускай праваслаўнай царквы (БПЦ). У прыватнасці, закон абмяжоўвае права рэлігійных арганізацый ажыццяўляць рэлігійнае навучанне, патрабуе ад усіх рэлігійных суполак атрымання дазволу дзяржавы на прывоз і распаўсюд літаратуры, а таксама забараняе замежным грамадзянам узначальваць рэлігійныя арганізацыі. Канкардат і іншыя пагадненні паміж урадам і БПЦ надзяляюць БПЦ прывілеямі, якіх не маюць іншыя рэлігійныя групы. Беларуская праваслаўная царква ёсць экзархатам Рускай праваслаўнай царквы і адзінай афіцыйна прызнанай праваслаўнай дэнамінацыяй у краіне.

8 студзеня Лукашэнка назваў Беларускую праваслаўную царкву "галоўным ідэолагам краіны", сцвярджаючы пры гэтым, што "мы ніколі не адасаблялі сябе ад царквы". 28 красавіка ён паабяцаў, што ўрад дапаможа царкве "служыць Радзіме і народу". Аднак нягледзячы на прывілеяваны статус БПЦ, улады часам папярэджвалі лідэраў царквы аб недапушчальнасці іх "празмернага ўплыву".

Усімі рэлігійнымі пытаннямі займаецца Апарат упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў (АУСРН) пры Савеце міністраў. Згодна з законам, рэлігійныя арганізацыі павінны прайсці рэгістрацыю ці ў АУСРН, ці ў мясцовых і абласных органах улады. Толькі тыя групы, якія налічваюць не менш як 20 сябраў могуць зарэгістравацца ў якасці рэлігійных суполак. Сярод груп, якія падпадаюць пад абмежавальнае дзеянне гэтага палажэння, ёсць і прыход пяцідзесятнікаў, які налічвае толькі 13 дарослых сябраў.

На працягу года АУСРН адмаўляў у рэгістрацыі некаторым нетрадыцыйным рэлігійным групам, што рабіла сходы іх сябраў незаконнымі. Паводле АУСРН, па стане на студзень 2007 года, былі

афіцыйна зарэгістраваныя 25 рэлігійных дэнамінацый, прадстаўленых 3 103 рэлігійнымі арганізацыямі.

Ведамства, адказнае за рэлігійныя пытанні, па-ранейшаму адмаўляла ў рэгістрацыі дэнамінацыям, якія лічыла нетрадыцыйнымі, пераважна гэта тычылася пратэстанцкіх груп, такіх як царква “Новае Жыццё” і Беларуская Евангельская царква. Большасць хрысціянскіх суполак выступалі за ўнясенне зменаў у нацыянальны закон аб свабодзе веравызнання, прыняты ў 2002 годзе, які абмяжоўвае іх дзейнасць і робіць магчымым крымінальны пераслед за рэлігійныя перакананні.

Аднак у адрозненне ад папярэдніх гадоў, службовыя асобы зарэгістравалі некалькі суполак “Харэ Крышна”. 22 снежня прадстаўнік адной суполак паведаміў, што шэсць з сямі суполак “Харэ Крышна” прайшлі рэгістрацыю. Суполка ў Бабруйску застаецца незарэгістраванай, але працягвае сваю дзейнасць. Праз шэсць гадоў, пасля шматлікіх судовых разбіральніцтваў і штрафаў суполкам нарэшце дазволена на законных падставах праводзіць цырымоніі і рытуалы.

2 сакавіка Канстытуцыйны суд адмовіўся прыняць да разгляду зварот, пад якім было 50 000 подпісаў і які заклікаў унесці змены ў асноўныя абмежавальныя палажэнні, прадугледжаныя рэлігійным заканадаўствам. Паводле суда, выносіць на разгляд пытанні адпаведнасці закона Канстытуцыі могуць толькі прэзідэнт і ўрадавыя службоўцы.

Паводле закона, выкарыстанне жылой плошчы для набажэнстваў дазваляецца толькі пасля афіцыйнага вывядзення яе з жылога фонду, а гэта значыць, што ўсе рэлігійныя арганізацыі павінны перарэгістраваць сваю маёмасць. Улады па-ранейшаму адмаўлялі ў перарэгістрацыі маёмасці многім пратэстанцкім цэрквам і іншым нетрадыцыйным канфесіям, таму суполкі часта былі вымушаныя сустракацца нелегальна або дома ў каго-небудзь з сябраў.

Урад па-ранейшаму абмяжоўваў магчымасці суполак валодаць маёмасцю ці выкарыстоўваць маёмасць для рэлігійных мэтаў. Калі маёмасць не зарэгістраваная, рэлігійная дзейнасць на яе тэрыторыі ёсць незаконнай.

25 лістапада Вышэйшы гаспадарчы суд зноў адклаў слуханні па зыску царквы “Новае жыццё” супраць прадстаўнікоў Мінскіх уладаў у сувязі з пазбаўленнем царквы ў 2005 годзе зямлі і маёмасці. Раней гаспадарчы суд ніжэйшай інстанцыі прыняў рашэнне на карысць гарадскіх уладаў, загадаўшы царкве вызваліць будынак і прадаць яго гораду па цане, ніжэйшай за рынкавую. У верасні

гарадскія ўлады прапанавалі царкве іншы надзел зямлі, які быў у чатыры раза меншы, і царква адхіліла прапанову.

Закон дазваляе асобам збірацца ў прыватных дамах для малітвы, аднак для правядзення дома рытуалаў, абрадаў ці цырымоній патрэбны дазвол мясцовых уладаў. На працягу года міліцыя некалькі разоў перапыняла рэлігійныя сходы, што праводзіліся ў прыватных дамах, часам арыштоўвала і штрафавала ўдзельнікаў.

За незаконнае правядзенне набажэнстваў баптыстаў, пяцідзесятнікаў ды іншых пратэстантаў штрафавалі ці папярэджвалі па абвінавачаннях у парушэнні грамадскага парадку ці правядзенні несанкцыянаваных сходаў.

28 красавіка і зноў 9 чэрвеня пастара-пяцідзесятніка Валянціна Баравіка абвінавацілі ў кіраванні дзейнасцю незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыі. Яго аштрафавалі на 140 000 беларускіх рублёў (65 даляраў) у першы раз і на 315 000 беларускіх рублёў (146 даляраў) у другі.

Паводле закона, грамадзяне  маюць права свабодна гаварыць пра свае рэлігійныя перакананні. Аднак улады па-ранейшаму прадухілялі, спынялі прапаведаванне ад імя любых рэлігійных груп за выключэннем Беларускай праваслаўнай царквы, а таксама каралі асобаў за такія дзеянні.

Урад не дазваляў замежным місіянерам ажыццяўляць рэлігійную дзейнасць за межамі тых арганізацый, якія іх запрасілі. Закон патрабуе, каб замежных місіянеры атрымлівалі гадавыя шматразовыя візы для ажыццяўлення "рэлігійнай дзейнасці". Назіральнікі выказвалі занепакоенасць адсутнасцю ўніфікаваных урадавых палажэнняў, якія рэгулявалі б прымяненне заканадаўства ў дачыненні да візаў, што можа ўплываць на магчымасць для місіянераў жыць і працаваць у краіне.

7 лютага Савет міністраў прыняў дырэктыву, што пералічвае падставы, на якіх замежным клерыкам можна не дазволіць прыехаць у краіну на запрашэнне мясцовых рэлігійных арганізацый. Сярод такіх прычын і наяўнасць ў дакументах дадзеных, што не адпавядаюць рэчаіснасці, і няведанне расейскай ці беларускай мовы, і здзейсненае раней адміністрацыйнае правапарушэнне ці любая ранейшая адмова ў наведванні краіны. Замежныя клерыкі таксама павінны падаваць большую колькасць дакументаў, што робіць працэдуры груваскімі.

Па словах Сяргея Луканіна, юрыста Мінскай пратэстанцкай царквы "Новае жыццё", дырэктыва абмяжуе колькасць замежных святароў,

што наведваюць краіну. Ён паведаміў, што за апошнія 18 месяцаў 28 замежных клерыкаў ці былі дэпартаваныя, ці не здолелі падоўжыць свае візы.

Закон таксама забаранае заснаванне прадстаўніцтваў замежных арганізацый, чыя дзейнасць скіраваная на распальванне "нацыянальнай, рэлігійнай, расавай варожасці" ці можа "адмоўна ўздзейнічаць на стан фізічнага ці псіхічнага здароўя людзей".

17 снежня траім рыма-каталіцкім святарам, што працавалі ў Гарадзенскай дыяцэзіі, адмовілі ў падаўжэнні дазволу на рэлігійную дзейнасць. Па меркаванні ўладаў, святары недастаткова добра валодалі дзяржаўнымі мовамі, хаця і працавалі ў краіне на працягу многіх гадоў.

Замежных грамадзян, якія афіцыйна знаходзяцца ў краіне з нерэлігійнымі мэтамі, за ўдзел у рэлігійнай дзейнасці могуць папярэджваць ці пазбаўляць права на знаходжанне ў краіне.

Закон не прадугледжвае вяртання маёмасці, захопленай падчас нацысцкай акупацыі ці за савецкім часам, і абмяжоўвае вяртанне маёмасці, што выкарыстоўваецца для культурніцкіх і адукацыйных мэтаў.

Па стане на канец года, ўлады так і не выканалі свайго абяцання знайсці новае месца для дзяржаўнага архіву, які захоўваўся ў будынках былога кляштара бернардынаў, рыма-каталіцкага кляштара ў цэнтры Мінску. У сакавіку 2007 года ўрад абвясціў пра план ператтварэння кляштара ў гатэль і забаўляльны цэнтр. План выклікаў пратэсты з боку каталіцкай супольнасці, што прымусіла ўлады прыпыніць яго выкананне.

### Злоўжыванні і дыскрымінацыя ў грамадстве

Адносіны паміж рэлігійнымі групамі былі пераважна добразычлівымі, панавала этыка талерантнасці. Аднак на працягу года некалькі культавых месцаў пацярпелі ад нападаў вандалаў, і паступалі сведчанні пра асобныя антысеміцкія праявы.

19 снежня раённы суд забараніў як "экстрэмісцкія" і "антысеміцкія" 13 рэлігійных кніг да іншых матэрыялаў, што выдала і распаўсюджвала Мінская кампанія "Праваслаўная ініцыятыва". Генеральная пракуратура таксама скасавала ліцэнзіі кампаніі на выдавецкую дзейнасць і рознічны продаж і канфіскавала 50 000 брашур, якія, па меркаванні ўладаў, распальвалі нянавісць паміж праваслаўнымі вернікамі ды іўдзеямі.

**BELARUS**

Аднак у краіне па-ранейшаму прадавалі антысеміцкія і расейскія ультранацыяналістычныя і ксенафобскія газеты, літаратуру, лічбавыя дыскі і відэакасеты, прывезеныя з Расеі.

Паводле дадзеных яўрэйскіх суполак, яўрэямі сябе ўсведамляюць ад 50 000 да 70 000 чалавек. Бальшыня яўрэяў краіны не былі актыўнымі вернікамі.

На працягу года па-ранейшаму назіраліся антысеміцкія праявы, аднак расследаваліся толькі асобныя акты антысемітызму. Урад не праводзіў адукацыйных кампаній за талерантнасць і супраць забабонаў.

Яўрэйскія арганізацыі і грамадзянская супольнасць па-ранейшаму выказвалі заклапочанасць ідэяй "больш шчыльнага славянскага саюза", папулярнай сярод нацыяналістычных арганізацый, у тым ліку "Русского национального единства" (РНЕ), групы, якая працягвала сваю дзейнасць, нягледзячы на тое, што была афіцыйна распушчаная ў 2000 годзе. Намеснік начальніка аддзела па прадухіленні злачыннасці сярод непаўналетніх Міністэрства ўнутраных спраў Андрэй Саладоўнікаў прызнаў, што ў краіне ёсць некалькі неанацысцкіх груповак. Па яго словах, КДБ адсочвае іх дзейнасць, яны "слаба арганізаваныя і не карыстаюцца папулярнасцю сярод маладых людзей".

У кастрычніку 2007 года сябры яўрэйскай суполкі ў Бабруйску знайшлі разбітымі 15 надмагільных камянёў на гарадскіх яўрэйскіх могілках. Гэта быў чацвёрты напад на могілкі з пачатку года. Раней каля могілак з'явіліся антысеміцкія надпісы, і была пашкоджаная агароджа магілы. Іншыя могілкі горада таксама пацярпелі. Міліцыя вызначыла трох падазраваных асобаў і накіравала справу ў суд, але ніхто не быў прызнаны вінаватым.

У адрозненне ад 2007 года, ні прэзідэнт, ні іншыя афіцыйныя асобы не рабілі прылюдных антысеміцкіх заўвагаў. 21 кастрычніка прэзідэнт Лукашэнка прыняў удзел у цырымоніях з нагоды 65-тых угодкаў знішчэння Мінскага яўрэйскага гета нацысцкімі акупантамі. У сваім выступе Лукашэнка аддаў даніну павагі ахвярам і іх сем'ям і адзначыў, што Беларусь "успрыняла гора яўрэйскага народа як сваю ўласную бяду".

Больш дэталёвая інфармацыя ўтрымліваецца ў Справаздачы аб захаванні свабоды веравызнання ў краінах свету за 2008 год: www.state.gov/g/drl/irf/rpt

г) свабода перамяшчэння, вымушаныя перасяленцы, абарона ўцекачоў і асобаў без грамадзянства

**BELARUS**

Закон забяспечвае свабоду перамяшчэння, у тым ліку права на эміграцыю. Аднак улады часам абмяжоўвалі права грамадзян выяжджаць за мяжу. Урад супрацоўнічаў з Офісам Вярхоўнага камісара ААН па справах уцекачоў (UNHCR) і іншымі гуманітарнымі арганізацыямі ў справе забеспячэння абароны і дапамогі вымушаным перасяленцам, уцекачам, уцекачам, што вяртаюцца дадому, асобам, што звяртаюцца па прытулак, асобам без грамадзянства ды асобам, становішча якіх выклікае занепакоенасць.

У студзені праз прэзідэнцкі дэкрэт выездныя штампы былі замененыя на кампутарызаваную ўрадавую базу дадзеных, з дапамогай якой правяраюць, ці дзейныя пашпарты, і вядуць улік замежных вандровак грамадзян. Паводле інфармацыі Міністэрства ўнутраных спраў, база дадзеных утрымлівае імёны не менш як 100 000 асобаў, якім забаронена выяжджаць за мяжу, у тым ліку тых, што мае доступ да дзяржаўных сакрэтаў, праходзіць у якасці абвінавачанага па крымінальнай ці адказчыка па грамадзянскай справе альбо мае нявыкананыя фінансавыя абавязацельствы. Апазіцыйныя палітыкі і актывісты грамадзянскай супольнасці крытыкавалі базу дадзеных, заяўлялі, што яна абмяжоўвае свабоду перамяшчэння. Некаторым асобам паведамлялі пісьмова, што іх імёны ўнесеныя ў базу дадзеных, некаторым паведамлялі пра гэта на памежных пераходах. У некаторых выпадках актывістаў апазіцыі спынялі на мяжы і адпраўлялі назад альбо затрымлівалі для працяглагаператрусу.

Па стане на канец года, у базе дадзеных былі імёны не менш як 17 лідэраў апазіцыі ды іншых актывістаў, у тым ліку Анатоля Лябедзькі, Сяргея Скрабца і моладзевых лідэраў Зміцера Дашкевіча, Зміцера Федарука і Аляксандра Атрошчанкава.

У адпаведнасці з прэзідэнцкім дэкрэтам, кожны студэнт, што жадае навучацца за мяжой, павінен атрымаць дазвол міністра адукацыі. Гэты дэкрэт, быццам бы скіраваны супраць гандлю людзьмі, таксама абавязвае Міністэрства ўнутраных спраў весці ўлік грамадзян, што працуюць за мяжой, а турыстычныя агенцыі паведамляць пра асобаў, што не вярнуліся з-за мяжы ў запланаваны час.

Закон абавязвае асобаў, якія едуць у месцы, што знаходзяцца на адлегласці 25 кіламетраў (15 міль) ці бліжэй да мяжы, атрымліваць спецыяльны пропуск.

Законам не прадугледжваецца прымусовая высылка з краіны, аднак па сведчаннях крыніц, сілы бяспекі пагражалі лідэрам апазіцыі фізічнай расправай ці крымінальным пераследам, калі тыя не

паедуць з краіны. Заканадаўства дазваляе высылку ў межах краіны асуджаных за злачынствы (“хімію”).

Многія студэнты універсітэтаў, якіх выключылі ці пагражалі выключыць за палітычную дзейнасць, самастойна прынялі рашэнне паехаць з краіны. З 2006 года больш як 500 студэнтаў вырашылі працягваць сваё навучанне ў замежных (часцей еўрапейскіх) універсітэтах. Аднак некалькі студэнтаў паведамілі, што іх імёны ўнесеныя ва ўрадавую базу дадзеных, што не дазваляе ім выехаць за межы краіны, каб працягнуць навучанне.

Унутраны пашпарт па-ранейшаму быў асноўным пасведчаннем асобы, неабходным для афармлення сталага месца жыхарства, уладкавання на працу, рэгістрацыі ў гатэлі. Міліцыя па-ранейшаму пераследавала асобаў, што жылі не па тым адрасе, што запісаны ва ўнутраным пашпарце як афіцыйны.

Абарона ўцекачоў

Закон гарантуе прытулак ці наданне статусу ўцекача ў адпаведнасці з Канвенцыяй ААН ад 1951 года аб статусе ўцекачоў і яе Пратаколам 1967 года, і ўрад распрацаваў сістэму забеспячэння абароны ўцекачоў.

На практыцы ўрад забяспечваў некаторую ступень абароны ўцекачоў ад высылкі ці вяртання ў краіны, дзе іх жыццё ці свабода апынуцца пад пагрозай. У краіне было каля 800 чалавек са статусам уцекача і каля 2 000 чалавек, што звярнуліся па прытулак. Уцекачы паходзяць пераважна з Азербайджана, Грузіі, Таджыкістана, Ірана, Афганістана, Індыі і Пакістана.

Нягледзячы на тое, што ўсе замежныя грамадзяне маюць права прасіць прытулку, улады па-ранейшаму адказвалі адмоўна на хадайніцтвы аб прытулку, пададзеныя грамадзянамі Расейскай Федэрацыі. Іміграцыйныя службы і суды сцвярджалі, што ў адпаведнасці з дамоўленасцямі аб стварэнні саюзнай дзяржавы Беларусі і Расейскай Федэрацыі і аб роўных правах грамадзян, грамадзяне Расеі і Беларусі карыстаюцца роўнымі правамі.

Асобы, што звярнуліся па прытулак, могуць свабодна рухацца ў межах краіны, але павінны жыць у тым рэгіёне, які яны пазначылі ў сваім хадайніцтве аб статусе ўцекача, і месца іх пражывання павінна быць вядомым ўладам. Крыніцы паведамлялі, што ўлады часта патрабуюць, каб асобы, што імкнуцца атрымаць прытулак, сяліліся ў сельскай мясцовасці. Пра змену месца жыхарства неабходна паведамляць уладам. Зарэгістраваныя асобы, што звярнуліся па прытулак, атрымліваюць даведкі, якія

выкарыстоўваюцца як пасведчанні асобы і абараняюць іх ад высылкі. Паводле закона, яны таксама павінны прайсці рэгістрацыю ў мясцовых органах улады, каб атрымаць унутраны пашпарт.

Асобы без грамадзянства

Паводле закона, грамадзянства вызначаецца па нараджэнні на тэрыторыі краіны ці паводле грамадзянства бацькоў. Дзіця грамадзяніна Беларусі ёсць грамадзянінам Беларусі, дзе б яно ні нарадзілася, нават калі другі з бацькоў не ёсць грамадзянінам Беларусі. Дзеці асобаў без грамадзянства і дзеці невядомых бацькоў лічацца грамадзянамі Беларусі толькі ў тым выпадку, калі нарадзіліся на яе тэрыторыі.

Паводле публікацыі ад 20 чэрвеня са спасылкай на афіцыйныя статыстычныя дадзеныя, у краіне каля 8 000 асобаў без грамадзянства.

У цэлым не існавала праблемы адвольных затрыманняў ці гвалту ў дачыненні да асобаў без грамадзянства. Аднак паводле крыніц, пры ўладкаванні на працу асобы без грамадзянства сутыкаліся з дыскрымінацыяй, таму што ўлады часта патрабавалі, каб яны жылі ў сельскай мясцовасці, і забаранялі ім шукаць працу за межамі рэгіёна, у якім яны жылі. На практыцы асобы без грамадзянства не мелі магчымасці пераехаць жыць у іншы рэгіён.

Раздзел 3. Забеспячэнне палітычных правоў: права грамадзян мяняць свой урад

У адпаведнасці з законам, грамадзяне маюць права мяняць свой урад мірным шляхам. Аднак на справе ўлады пазбаўлялі грамадзян гэтага права.

З моманту свайго абрання ў 1994 годзе першым прэзідэнтам краіны на тэрмін 5 гадоў, Лукашэнка няўхільна канцэнтраваў уладу ў выканаўчай галіне, каб падпарадкаваць сабе ўсе галіны ўлады. У 1996 і 2004 гадах праз неадпаведныя стандартам рэферэндумы канстытуцыю змянілі, пашырыўшы прэзідэнцкія паўнамоцтвы, падоўжыўшы тэрмін прэзідэнцтва Лукашэнкі і скасаваўшы абмежаванне на колькасць тэрмінаў прэзідэнцтва. Лукашэнка застаўся на трэці тэрмін праз сфальшафаваныя прэзідэнцкія выбары ў сакавіку 2006 года.

Паводле канчатковай справаздачы місіі назіральнікаў Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ (БДІПЧ), парламенцкія выбары 28 верасня ў значнай ступені не адпавядалі міжнародным стандартам дэмакратычных выбараў. Нягледзячы на

абвешчаны прэзідэнтам намер правесці свабодныя і справядлівыя выбары, улады зрабілі сур’ёзныя захады супраць гарантаваных канстытуцыяй свабодаў выказвання, асацыяцый і сходаў. Усе 110 кандыдатаў, прызнаных пераможцамі, былі прыхыльнікамі палітыкі Лукашэнкі.

У справаздачы таксама былі адзначаныя некаторыя паляпшэнні, у тым ліку тое, што ўлады супрацоўнічалі з БДІПЧ АБСЕ, і прагрэс у тым, што кандыдатам дазволілі праводзіць сустрэчы і размяшчаць у эфіры перадвыбарную агітацыю. Аднак у цэлым выбары праходзілі ў створанай уладамі атмасферы, якая не дапускала сапраўднай палітычнай канкурэнцыі і дзейнасці кандыдатаў у роўных умовах.

Выбары і ўдзел у палітыцы

Напярэдадні выбараў Лукашэнка абвясціў пра свой намер правесці празрыстыя выбары і сказаў, што выбарнае заканадаўства было насамрэч парушана, каб задаволіць патрабаванні захаду аб празрыстасці і адпаведнасці дэмакратычным стандартам. Напрыклад, службовыя асобы, адказныя за правядзенне выбараў, сцвярджалі, што зарэгістравалі кандыдатаў, нягледзячы на памылкі ў іх рэгістрацыйных бланках. Пасля сфальсіфікаваных прэзідэнцкіх выбараў 2006 года Лукашэнка рабіў падобныя заўвагі, сцвярджаючы, што вынікі былі сфальсіфікаваныя на карысць траіх яго апанентаў, каб супакоіць захад. Паводле афіцыйных вынікаў, Лукашэнка атрымаў 83 адсоткі галасоў, аднак ён сцвярджаў, што насамрэч перамог з 93 адсоткамі.

Журналісты і міжнарожныя назіральнікі на выбарах ахарактарызавалі кампанію, што папярэднічала выбарам 28 верасня, як “прыглушаную”. Паводле справаздачы БДІПЧ АБСЕ, сродкі масавай інфармацыі не забяспечвалі выбарцаў істотнай інфармацыяй, на падставе якой яны маглі б рабіць свядомы выбар, палітычныя партыі адыгрывалі нязначную ролю, а абмежаванні, уведзеныя ўладамі, не дазвалялі праводзіць актыўныя кампаніі з сапраўднай канкурэнцыяй.

Працэдуры рэгістрацыі не дазволілі ўсім высунутым кандыдатам прыняць удзел у кампаніі. Паводле слоў многіх кандыдатаў, ім было адмоўлена ў рэгістрацыі на падставе адміністрацыйных і тэхнічных недахопаў у пададзеных дакументах. Каля 365 кандыдатаў падалі дакументы на ўдзел у выбарах, і 285 былі зарэгістраваныя. Падчас кампаніі некалькі ўдзельнікаў знялі свае кандыдатуры. Каля 60 кандыдатаў ад апазіцыі прынялі ўдзел у саміх выбарах.

Паводле справаздачы БДІПЧ АБСЕ, нягледзячы на тое, што працэс выбараў быў добра арганізаваны, прызнаць яго вартым даверу не

дазволіла працэдура падліку галасоў, якая не адпавядала стандартам. Паводле назіральнікаў, 48 адсоткаў выбарчых участкаў, на якіх праводзілася назіранне падчас падліку галасоў, атрымалі адзнакі “кепска ці вельмі кепска”. У дадатак, нягледзячы на неаднаразовыя звароты з пачатку працы місіі назіральнікаў БДІПЧ АБСЕ ў сярэдзіне красавіка, назіральнікі сцвярджалі, што ў 35 адсотках выпадкаў ім не дазвалялі ці перашкаджалі назіраць за падлікам галасоў.

Мясцовыя праваабаронцы, Беларускі Хельсінкскі камітэт і незалежныя назіральнікі таксама крытыкавалі вынікі выбараў і выбарчыя працэдуры, што не адпавядалі стандартам. Паводле іх ацэнак, сярод галоўных хібаў - прымусовае датэрміновае галасаванне, немагчымасць атрымаць ад выбарчых камісій дадзеныя па колькасці выбарнікаў, што прагаласавалі датэрмінова, адмова з боку выбарчых камісій паведаміць назіральнікам пра колькасць бюлетэняў, дастаўленых на выбарчы ўчастак. Паводле высновы мясцовых назіральнікаў, падлік галасоў не быў празрыстым, таму што назіральнікаў выдалялі з выбарчых участкаў або не дазвалялі ім назіраць на працэсам падліку.

На працягу ўсёй кампаніі кандыдаты ад апазіцыі паведамлялі аб праявах несправядлівага стаўлення, у тым ліку, абмежаванні доступу да эфіру ці месцаў правядзення сходаў. Былі выпадкі адмовы з боку дзяржаўных друкарняў друкаваць улёткі апазіцыі. Прыхільнікі апазіцыйных кандыдатаў таксама паведамлялі пра пераслед з боку ўладаў, у тым ліку пра канфіскацыі выбарчых матэрыялаў.

Хаця намінальна прадстаўніцтва апазіцыі ў выбарчых камісіях павялічылася, улады па-ранейшаму не дапускалі ўключэння прадстаўнікоў апазіцыі ў выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў. У складзе Цэнтральнай выбарчай камісіі было чацвёра сябраў ад апазіцыі, якія мелі права выказваць меркаванне, але не галасаваць. Ва ўчастковых выбарчых камісіях актывісты апазіцыі складалі менш за 1 адсотак.

Палітычныя партыі па-ранейшаму атрымлівалі папярэджанні ад уладаў за дробныя парушэнні закона, які дазваляе ўладам прыпыніць дзейнасць палітычнай партыі на шэсць месяцаў за адно парушэнне і закрыць партыю за два парушэнні. Закон таксама забараняе партыям прымаць падтрымку з-за мяжы і патрабуе рэгістрацыі ўсіх палітычных блокаў і кааліцый у Міністэрстве юстыцыі.

У студзені у Міністэрства юстыцыі падала зыск аб ліквідацыі Партыі камуністаў беларускай (ПКБ), аднак паводле звестак

партыі, зыску не існавала, і партыя зарэгістравала 18 кандыдатаў для ўдзелу ў парламенцкіх выбарах 28 верасня. У жніўні 2007 года Вярхоўны суд пакінуў без зменаў рашэнне па зыску міністэрства прыпыніць дзейнасць ПКБ на падставе таго, што партыя не здолела пацвердзіць сяброўства ў арганізацыі больш як 200 з 1500 чалавек, унесеных у яе спісы.

У жніўні 2007 года, спаслаўшыся на меркаваныя недакладнасці ў пададзеных дакументах, Міністэрства ў другі раз адмовіла ў рэгістрацыі Саюзу левых сіл. У кастрычніку 2007 года Вярхоўны суд пакінуў без зменаў рашэнне па зыску Міністэрства юстыцыі ліквідаваць Беларускую партыю жанчын "Надзея" з-за меркаваных недахопаў ва ўставе партыі і рэгістрацыі рэгіянальных аддзяленняў.

Сярод 110 дэпутатаў ніжняй палаты Нацыянальнага сходу было 35 жанчын, а ў верхняй палаце 19 жанчын сярод 56 сяброў. Адну з 20 парламенцкіх камісій узначальвала жанчына, і ў Савеце Міністраў, што складаецца з 39 чалавек, была адна жанчына.

Ніводзін з высокапастаўленых службоўцаў ураду і Нацыянальнага сходу адкрыта не вызначаў сябе як прадстаўніка нацыянальнай меншасці, хоць сярод іх было некалькі палякаў і прадстаўнікоў іншых этнічных груп.

## Карупцыя ва ўрадзе і празрыстасць

Закон прадугледжвае крымінальную адказнасць за карупцыйныя злачынствы, звязаныя з выкарыстаннем службовага становішча, аднак паводле дадзеных, службовыя асобы па-ранейшаму ўдзельнічалі ў карупцыйнай дзейнасці. Паводле Сусветнага банка (яго індэкса якасці кіравання ў свеце), карупцыя была для краіны сур'ёзнай праблемай.

Непразрыстасць асабістых фондаў прэзідэнта і афіцыйных дзяржаўных рахункаў, а таксама высокая залежнасць ад небюджэтных паступленняў даюць паставы меркаваць пра карумпаванасць выканаўчай улады.

29 студзеня быў прыняты новы антыкарупцыйны закон, паводле якога пашыраны спіс прафесій, найбольш няўстойлівых перад карупцыяй, Генеральнай пракуратуры даручана каардынаваць высілкі па супрацьдзеянні карупцыі, службовым асобам забаронена мець банкаўскія рахункі за мяжой і займацца кумаўством.

8 лютага Лукашэнка загадаў генеральнаму пракурору палепшыць каардынацыю і ажыццяўленне расследаванняў злачыннасці і

карупцыі, бо яны ўзмацняюць сацыяльнае напружанне і амоўна ўплываюць на эканамічнае развіццё.

13 лістапада прэзідэнт пазбавіў пасадаў намесніка генеральнага пракурора і пракурора Мінскай вобласці ў сувязі з сумнеўнай пакупкай нерухомасці і стасункамі з карумпаванымі бізнэсоўцамі. 28 лістапада ў сувязі з гэтай справай ён пазбавіў пасадаў чатырох службоўцаў Міністэрства ўнутраных спраў, у тым ліку першага намесніка міністра Шчурка і намесніка міністра Філістовіча.

У перыяд са студзеня па лістапад улады расследавалі каля 2 600 парушэнняў з прыкметамі карупцыі, у асноўным здзейсненых службоўцамі ніжэйшага і сярэдняга ўзроўняў, у тым ліку 884 выпадкаў хабарніцтва. 4 чэрвеня кіраўнік Камітэта дзяржаўнага кантролю Сяргей Бараноўскі паведаміў, што яго апарат прыступіў да расследаванняў у адносінах да ўрадавых службоўцаў па фактах 59 эканамічных злачынстваў. 4 снежня генеральная пракуратура абвясціла, што карупцыя прынесла эканоміцы дзяржавы шкоду ў памеры 88 мільярдаў беларускіх рублёў у перыяд са студзеня па кастрычнік і што ў карупцыі было абвінавачана 1 470 чалавек.

Было шмат крымінальных спраў па абвінавачаннях у карупцыі. Аднак крымінальны пераслед заставаўся выбіральным.

Напрыклад, 5 лютага генеральная пракуратура абвясціла, што намеснік старшыні Аршанскага раённага выканаўчага камітэта асуджаны за злоўжыванне службовым становішчам і хабарніцтва і пакараны пазбаўленнем волі на восем гадоў за згоду прыняць у якасці “адкату” 18 мільёнаў беларускіх рублёў (8 370 даляраў) ад будаўнічай кампаніі.

27 сакавіка Аляксандра Бароўскага, былога старшыню дзяржаўнага нафтахімічнага канцэрна “Белнафтахім”, прыгаварылі да пазбаўлення волі на пяць гадоў за злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі. Яго арыштавалі ў траўні 2007 года па абвінавачаннях у прысабечванні, злоўжыванні службовым становішчам і раскрыцці сакрэтнай інфармацыі, што прынесла дзяржаве шкоду ў памеры больш  як 3,5 мільёны беларускіх рублёў (1 630 даляраў). У снежні Бароўскага выпусцілі на волю.

Законы, дзяржаўная палітыка і прэзідэнцкі ўказ жорстка абмяжоўваюць доступ грамадства да ўрадавай інфармацыі. Грамадзяне мелі пэўны доступ да некаторых катэгорый інфармацыі на ўрадавых Інтэрнэт-старонках ці ў базах дадзеных, але часта інфармацыя не была ні актуальнай, ні поўнай.

**BELARUS**

Раздзел 4. Адносіны ўладаў да расследавання міжнароднымі і недзяржаўнымі арганізацыямі меркаваных парушэнняў правоў чалавека

У краіне было некалькі актыўных мясцовых праваабарончых аб'яднанняў і НДА, аднак улады часта ставіліся варожа да іх высілкаў, не супрацоўнічалі з імі і не ўлічвалі іх стаўленне.

Улады даймалі НДА частымі праверкамі і пагрозамі скасавання рэгістрацыі, адсочвалі іх ліставанне і тэлефонныя размовы. Улады ігнаравалі справаздачы, падрыхтаваныя праваабарончымі недзяржаўнымі арганізацыямі, і рэдка сустракаліся з іх прадстаўнікамі. Афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі не паведамлялі пра праваабарончыя арганізацыі і іх дзейнасць; незалежныя СМІ, якія асвятлялі пытанні правоў чалавека, падлягалі пераследу і закрыццю.

Улады закрывалі, адмаўляліся рэгістраваць НДА і па-ранейшаму пераследвалі НДА паводле Артыкула 193 Крымінальнага кодэксу. Паводле заканадаўчых палажэнняў, уведзеных у 2005 годзе праз прэзідэнцкі дэкрэт, кіраванне дзейнасцю ці ўдзел у якой-кольвек дзейнасці незарэгістраванай НДА ёсць крымінальнымі злачынствам. Закон таксама забараняе дзейнасць ад імя незарэгістраваных НДА. Некалькі нацыянальных і міжнародных праваабарончых аб'яднанняў, у тым ліку і "Міжнародная амністыя", заклікалі ўлады скасаваць Артыкул 193 і іншыя юрыдычныя перашкоды, што замінаюць дзейнасці НДА і дазваляюць уладам пераследаваць грамадзянскую супольнасць і моладзевых актывістаў.

Паводле дадзеных Асамблеі дэмакратычных НДА, за апошнія чатыры гады больш як 300 НДА былі ці закрытыя ўладамі, ці вымушаныя закрыцца на падставе шэрагу юрыдычных і палітычна матываваных падстаў. У 2007 годзе "Human Rights Watch" паведаміла, што ў зарэгістраванымі ў краіне засталіся толькі пяць буйных праваабарончых аб'яднанняў.

У адрозненне ад 2007 года, Міністэрства юстыцыі 17 снежня дазволіла рэгістрацыю грамадзянскага недзяржаўнага аб'яднання "За Свабоду", лідэрам якога ёсць былы кандыдат на прэзідэнцкую пасаду Аляксандр Мілінкевіч. Раней міністэрства тройчы адмаўлялася рэгістраваць аб'яднанне, спасылаючыся на неналежным чынам аплачаныя рэгістрацыйныя пошліны, недакладнасці ва ўставе, арганізацыю несанкцыянаванага вулічнага шэсця і тэхнічныя недахопы ў рэгістрацыйных дакументах.

**BELARUS**

Улады могуць закрыць НДА, зрабіўшы ўсяго адно папярэджанне аб парушэнні заканадаўства. Найбольш частымі парушэннямі, якія прыводзілі да папярэджання ці закрыцця былі няздольнасць атрымаць юрыдычны адрас і наяўнасць неадпаведнасцяў у рэгістрацыйных дакументах. Закон дазваляе ўладам закрываць НДА за незаконнае атрыманне дапамогі з-за мяжы, а Міністэрству юстыцыі ўдзельнічаць у любой дзейнасці і правяраць любыя дакументы НДА. НДА таксама абавязаныя штогод падаваць падрабязную справаздачу аб сваёй дзейнасці, паведамляць адрасы офісаў, дадзеныя кіраўнікоў і агульную колькасць сяброў.

24 красавіка пачаў дзейнічаць прэзідэнцкі ўказ ад 2007 года, у адпаведнасці з якім арэндная плата большасці НДА павялічылася ў 10 разоў. Да з’яўлення ўказа НДА плацілі адзін еўра (1,4 даляры) за адзін квадратны метр офіснай плошчы, а камерцыйныя ўстановы плацілі 10 еўра (7 даляраў). Хаця некаторыя арганізацыі, напрыклад, моладзевыя спартыўныя аб’яднанні, дабрачынныя арганізацыі і дзіцячыя мастацкія студыі па-ранейшаму плацілі адзін еўра, іншыя НДА, напрыклад, Беларускае добраахвотніцкае таварыства аховы гістарычных і культурных помнікаў, папрасілі заплаціць па павышанай стаўцы. Многія НДА паведамілі, што павышэнне арэнднай платы верагодна прымусіць іх закрыцца.

11 чэрвеня ў Мінску раённы суд прыняў рашэнне арыштаваць моладзевых актывістаў Аб’яднанай грамадзянскай партыі Міхаіла Пашкевіча і Віталя Стажарава на 15 дзён і Кірыла Паўлоўскага на 10 дзён, прызнаўшы іх вінаватымі ў дробным хуліганцтве. Праваабаронцы звязвалі арышты з выбухам, які адбыўся ў Мінску 3 ліпеня.

На працягу года зарэгістраванае ГА “Беларускі Хельсінкскі камітэт” па-ранейшаму мела праблемы з уладамі. 29 лютага Вярхоўны суд дазволіў Міністэрству юстыцыі адклікаць зыск аб прыпыненні дзейнасці БХК. Аднак банкаўскія рахункі НДА заставаліся заблакаванымі і падаткавыя патрабаванні не былі скасаваныя. Справа вядзецца з 2006 года, калі ўлады канфіскавалі офіснае абсталяванне БХК у кошт аплаты штрафа ў памеры 160 мільёнаў рублёў (74 400 даляраў) за падаткі, налічаныя post factum, на фінансавую дапамогу, атрыманую з-за мяжы. Пазней, напярэдадні і пасля парламенцкіх выбараў 28 верасня, службы фінансавага кантролю патрабавалі ад сяброў БХК задэкларавацць свае даходы і падаць іншую інфармацыю.

Улады неахвотна абмяркоўвалі пытанні правоў чалавека з міжнароднымі НДА, прадстаўнікі якіх часта мелі цяжкасці пры атрыманні дазволу на наведванне краіны. Улады неаднаразова ігнаравалі рэкамендацыі НДА, скіраваныя на паляпшэнне сітуацыі з

правамі чалавека ў краіне, і іх заклікі спыніць пераслед грамадзянскіх аб’яднанняў.

У ліпені 2007 года скончыўся і не быў падоўжаны тэрмін мандату Спецыяльнага дакладчыка ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Улады адмаўляліся супрацоўнічаць з дакладчыкам, Адрыянам Северыным, з моманту яго прызначэння ў ліпені 2004 года, стала адмаўляючы яму ў магчымасці наведаць краіну.
У 2006 годзе Севярын адзначыў, што стан правоў чалавека ў краіне пагоршыўся “да такой ступені, што можна заўважыць паказальнікі, якія звычайна ёсць вызначальнымі для дыктатур”. Паводле слоў Северына, грамадзянскія і палітычныя правы былі абмежаваныя, культурныя правы ігнараваліся, забеспячэнне эканамічных і іншых правоў залежала ад паслухмянасці ўладам.

У снежні 2007 года, другі год запар, Генеральная асамблея ААН прыняла рэзалюцыю, у якой выказала глыбокую занепакоенасць станам правоў чалавека ў краіне, у прыватнасці, “настойлівым” цкаваннем і праследам з боку ўраду актывістаў апазіцыі і незалежных НДА. У рэзалюцыі таксама выказвалася занепакоенасць тым, што высокія дзяржаўныя службоўцы мелі дачыненне да знікненняў сябраў апазіцыі Юрыя Захаранкі і Віктара Ганчара і бізнэсоўца Анатоля Красоўскага ў 1999 годзе і тэлежурналіста Змітра Завадскага ў 2000 годзе, а таксама тым, што ўлады не здолелі правесці свабодныя і справядлівыя прэзідэнцкія выбары ў 2006 годзе.

Раздзел 5. Дыскрымінацыя, злоўжыванні ў грамадстве і гандаль людзьмі

Закон забараняе дыскрымінацыю паводле расавай ці палавой прыналежнасці, абмежаваных магчымасцяў, мовы ці сацыяльнага статусу. Аднак на практыцы ўлады не заўсёды абаранялі гэтыя правы. Існавалі праблемы гвалту супраць жанчын і дзяцей, гандлю людзьмі і дыскрымінацыі асобаў з абмежаванымі магчымасцямі, цыган, этнічных меншасцяў і гомасэксуалістаў.

Жанчыны

Паводле закона, згвалтаванне як такое ёсць крымінальным злачынствам, але забарона сужэнскага згвалтавання асобна не прапісана. Праблема згвалтаванняў існавала. Але бальшыня жанчын не паведамляла пра згвалтаванні праз сорам ці страх, што міліцыя абвінаваціць у тым, што здарылася, ахвяру. У 2007 годзе міністэрства ўнутраных спраў паведамляла пра 306 выпадкаў згвалтаванняў ці нападаў сэксуальнага характару.

**BELARUS**

Значнай праблемай быў гвалт у сям'і, у тым ліку жорсткае абыходжанне ў дачыненні да жанчын з боку сужэнцаў. У 2006 годзе "Міжнародная амністыя" адзначыла ў сваёй справаздачы, што ўлады не робяць дастатковых захадаў, каб абараніць жанчын ад жорсткага абыходжання ў сям'і. Крымінальны кодэкс не ўтрымлівае асобнага артыкула, што тычыўся б гвалту ў сям'і.

Жанчыны па-ранейшаму ўстрымліваліся ад паведамленняў пра выпадкі гвалтоўнага абыходжання праз страх помсты ці баючыся выклікаць асуджэнне грамадства. НДА арганізоўвалі працу прытулкаў, што размяшчаліся пераважна ў Мінску, але яны кепска фінансаваліся, і іх падтрымка з боку ўраду была абмежаванай.

Прастытуцыя ёсць незаконнай, але лічыцца хутчэй адміністрацыйным правапарушэннем, чым крымінальным злачынствам, і пакаранне прадугледжанае мяккае. Улады і мясцовыя назіральнікі-праваабаронцы адзначалі, што прастытуцыя не была сур'ёзнай праблемай. Аднак паводле неафіцыйных дадзеных, прастытуцыя распаўсюджвалася, асабліва па-за межамі вялікіх гарадоў. Сеткі арганізаванай прастытуцыі дзейнічалі ў дзяржаўных гатэлях. Паводле дадзеных гарадской міліцыі, у Мінску каля 500 жанчын былі калісьці затрыманыя за прастытуцыю.  Паводле ацэнак Святланы Бруцкай, кіраўніка праекта па супрацьдзеянні распаўсюду ВІЧ/СНІД, у Мінску займаюцца прастытуцыяй каля 3 000 асобаў. Па стане на верасень, улады паведамілі пра 68 зафіксаваных правапарушэнняў, звязаных з прастытуцыяй.

Сексуальныя дайманні, па наяўных звестках, былі шырока распаўсюджаныя, але для барацьбы з імі няма спецыяльных законаў, акрамя тых, што караюць за фізічны напад.

Міністэрства працы і сацыяльнага забеспячэння адказвае за забеспячэнне роўнасці правоў мужчын і жанчын, але яно не мае паўнамоцтваў уводзіць палажэнні, абавязковыя для выканання іншымі ўрадавымі ўстановамі. Закон, які ў цэлым выконваецца на практыцы, гарантуе роўныя правы жанчын у адносінах да валодання маёмасцю і атрымання спадчыны, у сферы сямейнага заканадаўства і ў сістэме правасуддзя. Закон таксама патрабуе выплаты аднолькавага заробку за аднолькавую працу, аднак на справе гэтае палажэнне не заўсёды выконвалася. Жанчын было вельмі мала на вышэйшых кіруючых альбо ўрадавых пасадах. Міністэрства статыстыкі і аналізу паведамляла, што 64 адсоткі беспрацоўных у краіне – жанчыны.

Закон дае жанчынам права на трохгадовае вызваленне ад працы для дагляду за дзіцём з захаваннем працоўнага месца па вяртанні на працу. Аднак працадаўцы абыходзілі гарантыі працаўладакавання

праз падпісанне кароткатэрміновых кантрактаў, якія адмаўляліся падаўжаць, калі жанчына зацяжарвала.

Дзеці

У асноўным улады клапаціліся пра сацыяльнае забеспячэнне і здароўе дзяцей.

З цыганскімі дзецьмі неналежна абыходзіліся дзеці-нецыгане і настаўнікі. Бальшыня маладых цыган не атрымлівала сярэдняй адукацыі. У Мінску не было дзяржаўнай школы для цыган, хаця былі школы для яўрэяў, літоўцаў і палякаў.

Звесткі пра жорсткае абыходжанне з дзецьмі з'яўляліся нячаста. Аднак паведамлялася пра гандаль дзецьмі для сэксуальнай эксплуатацыі і ў адным выпадку для прымусовай працы. За першае паўгоддзе 2007 года ў Мінскай вобласці ўлады змясцілі 301 непаўналетняга ў дзіцячыя апякунскія ўстановы.

У цэлым праблемы шлюбаў з дзецьмі не існавала. Аднак сярод цыган дзяўчынкі ва ўзросце ад 14 гадоў і хлопчыкі ва ўзросце 16 гадоў часта бралі шлюб са згоды бацькоў.

Гандаль людзьмі

Закон забараняе ўсе формы гандлю людзьмі, аднак гандаль людзьмі па-ранейшаму быў сур'ёзнай праблемай, і Беларусь заставалася краінай-крыніцай і краінай транзіту ахвяраў.

У перыяд са студзеня па верасень Міністэрства ўнутраных спраў выявіла 298 злачынстваў, звязаных з гандлем людзьмі, у тым ліку 62 выпадкі гандлю і 236 іншых спраў, звязаных з гандлем, напрыклад, прастытуцыі і выкрадання з мэтай сэксуальнай эксплуатацыі. За той жа перыяд улады прызналі 430 чалавек ахвярамі гандлю, з іх 296 былі вывезеныя за мяжу і 134 сталі ахвярамі эксплуатацыі ў межах краіны. З 430 ахвяраў 92 сталі ахвярамі гандлю для прымусовай працы, а астатнія - для сэксуальнай эксплуатацыі.

У 2007 годзе міністэрства паведаміла пра 97 выпадкаў гандлю і 344 іншыя выпадкі, звязаныя з гандлем людзьмі. Улады прызналі каля 418 чалавек ахвярамі гандлю, з якіх 378 (у тым ліку 22 непаўналетніх) сталі ахвярамі гандлю для сэксуальнай эксплуатацыі і 40 – ахвярамі гандлю для прымовай працы (у тым ліку адзін непаўналетні). У 2007 годзе значна павялічылася колькасць выпадкаў вывазу для прымусовай фізічнай працы, асабліва мужчын у Расею.

**BELARUS**

Жанчын пераважна вывозілі ў краіны Еўразвязу (асабліва ў Нямеччыну, Польшчу, Чэхію, Літву і Кіпр), на Сярэдні Ўсход (асабліва ў Ізраіль і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты), у Турцыю, Расею, Украіну і Японію. Вываз у Расею – гэта асаблівая праблема, таму што мяжа паміж краінамі адкрытая і таму што назіралася тэндэнцыя замоўчвання праблем у адносінах з Расеяй з палітычных меркаванняў. Большасць жанчын-ахвяраў гандлю шукалі магчымасці ўцячы ад кепскага эканамічнага ці сямейнага становішча. Паводле меркавання мясцовых няўрадавых арганізацый, узмацненне ўрадавых захадаў супраць жорсткага абыходжання ў сям'і ды алкагалізму прывяло б да рэзкага змяншэння колькасці жанчын, што шукаюць працы за мяжой.

Паводле дадзеных Міністэрства ўнутраных спраў, гандляры людзьмі звычайна належалі да слаба арганізаваных крымінальных сетак, што падтрымлівалі сувязі з буйнейшымі міжнароднымі арганізаванымі крымінальнымі коламі, публічнымі дамамі, клубамі ці барамі ў краінах прызначэння.

Гандляры заваблівалі сваіх ахвяраў праз рэкламныя паведамленні, кадравыя і мадэльныя агенцыі, а таксама праз асабісты кантакт з ахвярамі праз сяброў і сваякоў, прапануючы працаўладкаванне за мяжой ці нібыта шукаючы партнёраў для шлюбу. Гандляры часта забіралі ў ахвяраў дакументы і прымянялі фізічны і эмацыянальны ціск, сілу, падман і прымус для ўсталявання кантролю. У студзені 2007 года ўлады прызналі 13 кіраўнікоў беларускіх мадэльных агенцый вінаватымі ў гандлі больш як 600 жанчынамі для прастытуцыі ва Францыі, Турцыі і Аб'яднаных Арабскіх Эміратах у перыяд з 2002 па 2005 год. Асуджаных пакаралі пазбаўленнем волі на тэрміны ад васьмі да дванаццаці гадоў, канфіскацыяй маёмасці і штрафамі ў памеры 1,94 мільярды беларускіх рублёў (900 000 даляраў).

Закон прадугледжвае крымінальную адказнасць за злачынствы, звязаныя з гандлем людзьмі з мэтай сексуальнай ці іншай эксплуатацыі. Маёмасць асуджаных за гандаль людзьмі можа быць канфіскаваная. Мінімальны тэрмін пазбаўлення волі за гандаль людзьмі - пяць гадоў з канфіскацыяй маёмасці, а жорсткія формы гандлю людзьмі караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад 12 гадоў.

Прэзідэнцкія дэкрэты скасавалі крымінальную адказнасць за парушэнні закона, здзейсненыя ахвярамі гандлю людзьмі, вызначылі статус ахвяраў і прадугледзелі іх абарону, забеспячэнне медыцынскай дапамогай і паслугамі сацыяльнай рэабілітацыі, але толькі пры ўмове супрацоўніцтва ахвяраў з уладамі падчас следства і судовага пераследу гандляроў. Паступалі звесткі пра

тое, што службы, адказныя за супрадзеянне гандлю, часта прымушалі ахвяраў супрацоўнічаць са следствам.

Каардынацыяй дзяржаўных захадаў па барацьбе супраць гандлю людзьмі займаўся Дэпартамент па супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў. Аднак НДА дзейнічалі больш актыўна ў сферах прафілактыкі і рэабілітацыі. Урадавыя крыніцы паведамлялі, што ахвяры больш ахвотна звяртаюцца па дапамогу ў НДА, чым у дзяржаўныя ўстановы. НДА, што супрацьстаяць гандлю людзьмі, і міжнародныя арганізацыі скардзіліся на тое, што ўрад забяспечваў недастатковую і ў бальшыні выпадкаў нематэрыяльную дапамогу, а таксама не здолеў забяспечыць абавязковае фінансаванне дапамогі ахвярам. НДА актыўна ўдзельнічалі ў навучанні супрацоўнікаў урадавых структур, як праводзіць рэабілітацыю ахвяраў, але былі незадаволеныя практычнымі дзеяннямі рэгіянальных уладаў.

Міністэрства ўнутраных спраў заснавала Міжнародную акадэмію супрацьдзеяння гандлю людзьмі, і першая група спецыялістаў скончыла навучанне ў ліпені 2007 года. Цэнтр часткова фінансавала Міжнародная арганізацыя па міграцыі, а навучанне часткова забяспечвала міжнароднае недзяржаўнае аб’яднанне “La Strada”, якое працуе дзеля супрацьдзеяння гандлю людзьмі.

Па-ранейшаму пастулалі паведамленні пра карумпаваных службоўцаў праваахоўных органаў і памежных службаў, што садзейнічалі гандлю людзьмі, прымаючы хабар ці ігнаруючы выпадкі гандлю. Не было прыкметаў таго, што ўрад сістэматычна садзейнічаў гандлю людзьмі ці мірыўся з ім. Камітэт дзяржаўнага кантролю расследаваў падазрэнні ў службовай карупцыі, звязанай з гандлем людзьмі, у рамках дзейнасці Міжведамаснай камісіі па барацьбе са злачыннасцю, карупцыяй і абаротам наркотыкаў.

Ахвяры гандлю рэдка паведамлялі ў міліцыю пра гэтыя злачынствы, баючыся неразумення з боку грамадства, праз нежаданне мець справы з уладамі і недахоп сацыяльных паслуг і магчымасцяў для рэабілітацыі ахвяраў. Міністэрства працы і сацыяльнага забеспячэння падтрымлівала 23 сацыяльныя цэнтры, якія маглі дапамагаць ахвярам гандлю. Каб дапоўніць працу дзяржаўных цэнтраў, Праграма развіцця ААН, МАМ і “La Strada” таксама адкрылі рэабілітацыйныя прытулкі для ахвяраў і іх сем’яў.

Паводле ўраду, у краіне працавалі два спецыялізаваных крызісных цэнтры і 28 НДА, што прапаноўвалі паслугі ахвярам гандлю. “La Strada” праводзіла заняткі ў многіх тэрытарыяльных цэнтрах падтрымкі ахвяраў гандлю, але выказвала незадаволенасць тым, як працягваецца распачатая справа, а таксама пералічыла некалькі

выпадкаў, калі службовыя асобы ў рэгіёнах праяўлялі скептыцызм ці нячуласць ў дачыненні да ахвяраў.

"La Strada" і Асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын вялі гарачую лінію, што прапаноўвала кансультацыі ў сувязі з прапановамі працаўладкавання ці шлюбу за мяжой, якія маглі быць звязаныя з гандлем людзьмі. Са студзеня 2001 года гарачая лінія прыняла больш як 12 000 тэлефанаванняў.

У чэрвені кіраўнік Дэпартамента па кантролю за абаротам наркотыкаў і прадухіленні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў сказаў, што найлепшым сродкам барацьбы супраць гандлю ёсць інфармацыйныя кампаніі. Улады распаўсюджвалі інфармацыю праз дзяржаўныя ўстановы, змяшчалі ў дзяржаўным эфіры сацыяльную рэкламу, скіраваную супраць гандлю людзьмі, трымалі друкаваныя матэрыялы на ўваходах у нацыянальныя і замежныя дыпламатычныя ўстановы, арганізоўвалі круглыя сталы і семінары для НДА і ўрадоўцаў.

Каб прадухіліць гандаль людзьмі, улады загадалі ўсім фірмам, што прапануюць паслугі знаёмстваў праз Інтэрнэт, прайсці перарэгістрацыю, а таксама падаваць інфармацыю пра грамадзян і замежнікаў, якія маюць намер сустрэцца асабіста. Улады па-ранейшаму прымалі сур'ёзныя захады для абмежавання свабоды перамяшчэння і кантролю за перамяшчэннем, абвяшчаючы іх скіраванымі ў тым ліку супраць гандлю людзьмі.

Людзі з абмежаванымі магчымасцямі

У законе не прапісаныя асобныя забароны на дыскрымінацыю асобаў з абмежаванымі магчымасцямі пры працаўладкаванні, атрыманні адукацыі, доступу да медыцынскіх і іншых урадавых паслуг.

Міністэрства працы і сацыяльнага забеспячэння ёсць асноўным урадавым ведамствам, адказным за абарону правоў людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Закон патрабуе, каб транспарт, жылыя памяшканні ды ўстановы былі даступныя для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Аднак было мала публічных месцаў, даступных для людзей, што перасоўваюцца ў інвалідных вазках. Па дадзеных Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў (РАІК), больш як 75% людзей з абмежаванымі магчымасцямі не маглі выходзіць з дома без дапамогі.

Улады забяспечвалі людзей з абмежаванымі магчымасцямі мінімальнымі і, паводле звестак, нядзейнымі ільготамі. Напрыклад, асобы з абмежаванымі магчымасцямі, калі яны жывуць асобна, мелі права на 50-адсоткавую зніжку на аплату жылля і

камунальных паслуг. Мала хто меў права на гэтую ільготу, таму што будынкаў, прыстасаваных для асобаў з абмежаванымі магчымасцямі, мала, і такія асобы былі вымушаныя жыць або з сябрамі, або са сваякамі. Грамадскі транспарт быў бясплатным для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, аднак у Мінску ні метро, ні аўтобусы не былі прыстасаваныя для вазочнікаў. Урадавае абмежаванне даўжыні працоўнага дня да 7 гадзін для асобаў з абмежаванымі магчымасцямі прывяло да таго, што кампаніі неахвотна іх наймалі.

Нацыянальныя, расавыя і этнічныя меншасці

Па-ранейшаму адбывалася дыскрымінацыя з боку ўладаў і грамадства супраць этнічных палякаў і цыган. Таксама з боку грамадства назіраліся праявы варожага стаўлення да прыхільнікаў беларускай нацыянальнай культуры.

Улады па-ранейшаму пераследавалі непрызнаны Саюз палякаў Беларусі (СПБ), яго старшыню Анжаліку Борыс і яе паплечнікаў. 29 сакавіка міліцыянты спынілі машыну Борыс і зрабілі спробу правесці ператрус у пошуках незаконных друкаваных матэрыялаў. Пасля гэтага выпадка міліцыянты таксама правялі ператрус у офісе арганізацыі. 18 красавіка Борыс і яе паплечнікаў засняли на відэа, калі яны ехалі ў вёску Радунь, і аштрафавалі на 525 000 беларускіх рублёў (245 даляраў) за знаходжанне ў памежнай зоне без пропуска.

У дачыненні да цыганскай супольнасці, якая складае ад 40 000 да 60 000 чалавек, працягвалася дыскрымінацыя і боку ўладаў і грамадства.

Цыганская супольнасць па-ранейшаму сутыкалася з праблемамі высокага ўзроўню беспрацоўя і нізкага ўзроўню адукацыі. У 2005 годзе ўлады ацэньвалі ўзровень беспрацоўя сярод цыган у 80 адсоткаў. Часта цыганам адмаўлялі ў доступе да вышэйшай адукацыі ў дзяржаўных універсітэтах.

Згодна з законам, руская і беларуская мовы маюць аднолькавы статус, аднак на практыцы ўрад у асноўным карыстаўся рускай. У верасні 2007 года Рыгор Васілевіч, старшыня Канстытуцыйнага суда, засведчыў, што дыскрымінацыя адбываецца “нярэдка”, але сцвердзіў, што ў выпадках дыскрымінацыі звычайна праводзіцца адпаведнае разбіральніцтва.

Улады рабілі саступкі карыстальнікам беларускай мовы, напрыклад, пагаджаліся на змену шыльдаў з назвамі вуліц на беларускамоўныя, але прапановы па пашырэнні выкарыстання мовы стала адкідалі.

Ультранацыяналістычныя, этнічна рускія групоўкі скінхэдаў перасследавалі арганізацыі, што спрыяюць развіццю беларускай нацыяльнай культуры. 10 сакавіка ў Віцебску Барыс Хамайда з Кансэрватыўнай Хрысціянскай Партыі паведаміў пра атрыманне антысеміцкага ліста з пагрозамі ад мясцовага аддзялення ультранацыяналістычнай групоўкі "Русское национальное единство" (РНЕ), што ёсць незарэгістраванай арганізацыяй. Улады адмовіліся распачынаць крымінальную справу, абвясціўшы, што ліст не ўтрымлівае складу злачынства.

Іншыя віды злоўжыванняў і дыскрымінацыі ў грамадстве

Гомасексуалізм не ёсць незаконным, аднак была шырока распаўсюджаная дыскрымінацыя ў дачыненні да гомасэксуальстаў, і адзначаліся выпадкі пераследу. Паводле паведамленняў мясцовай групы па абароне правоў гомасексуалістаў, падкантрольныя дзяржаве СМІ імкнуліся паменшыць колькасць удзельнікаў акцый пратэсту ў сакавіку 2006 года пасля прэзідэнцкіх выбараў, назваўшы гэтыя акцыі часткай "блакітнай рэвалюцыі".

28 траўня трое маладых людзей здзейснілі напад на Эдуарда Тарлецкага, журналіста і абаронцы правоў гомасэксуалістаў. Паводле слоў Тарлецкага, ён не меў намеру заяўляць пра напад у міліцыю, таму што яна нічога не будзе прадпрымаць у сувязі з гэтым інцыдэнтам. Ён таксама паведаміў, што гэта быў трэці напад на яго за пяць гадоў.

Па-ранейшаму існавала праблема дыскрымінацыі з боку грамадства ў дачыненні да асобаў-насіцеляў ВІЧ/СНІД, і хвароба ўспрымалася грамадствам з моцным асуджэннем, нягледзячы на большую дасведчанасць у пытаннях ВІЧ/СНІДу і цярпімасць у адносінах да носьбітаў віруса. Напрыклад, у радзільных дамах ВІЧ-інфіцыраваных жанчын ужо не ізалявалі ад астатніх. Аднак паводле інфармацыі Офіса ААН на барацьбе са СНІД, ад носьбітаў ВІЧ/СНІДу па-ранейшаму паступалі шматлікія паведамленні пра выпадкі дыскрымінацыі. У верасні ўлады паведамілі, што 9 282 грамадзяніна краіны ёсць носьбітамі ВІЧ.

Раздзел 6. Правы працоўных

а) права на стварэнне аб'яднанняў

Закон дазваляе працоўным, за выключэннем супрацоўнікаў службаў бяспекі і вайскоўцаў, ствараць незалежныя саюзы і далучацца да іх, але на практыцы ўлады не паважалі гэтае права. На працягу года ўрад па-ранейшаму намагаўся перашкодзіць дзейнасці

незалежных саюзаў, спыніць іх дзейнасць і ўсталяваць поўны кантроль над усялякай прафсаюзнай дзейнасцю. Сярод захадаў для дасягнення гэтых мэтаў былі частыя выпадкі непадаўжэння працоўных дамоваў з сябрамі незалежных прафсаюзаў і адмовы некаторым прафсаюзам у рэгістрацыі.

Паводле слоў лідэра Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандра Ярашука, пасля з'яўлення ў 1999 годзе дэкрэта прэзідэнта Лукашэнкі, паводле якога прафсаюзы абавязаныя праходзіць дзяржаўную рэгістрацыю, не быў зарэгістраваны ніводзін незалежны прафсаюз.

Закон прадугледжвае права на правядзенне страйкаў, аднак жорсткі кантроль уладаў над масавымі сходамі ствараў складанасці для прафсаюзаў у іх правядзенні. У многіх выпадках кіраўніцтва і мясцовыя ўлады блакіравалі спробы працоўных арганізаваць страйк праз абвяшчэнне такіх дзеянняў незаконнымі.

Падкантрольная ўраду Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) была найбуйнейшай прафсаюзнай арганізацыяй у краіне з заяўленай колькасцю сябраў каля 4 мільёнаў. Аднак выглядае на тое, што гэта лічба завышаная, бо агульная колькасць усіх працоўных у краіне складае прыкладна 4 мільёны. БКДП быў самым вялікім незалежным аб'яднаннем і складаўся з чатырох прафсаюзаў з агульнай колькасцю сябраў каля васьмі тысяч.

Улады ў восьмы раз адмовілі ў рэгістрацыі Магілеўскай арганізацыі Прафсаюза працоўных радыё- і электроннай прамысловасці (РЭП). Паводле паведамленняў РЭП, улады адмовіліся рэгістраваць арганізацыю, таму што ўладальнік офіснага памяшкання, дзе месцілася арганізацыя, пад ціскам уладаў не дазволіў арганізацыі зарэгістраваць адрас офіса як свой юрыдычны.

Урад выкарыстоўваў адміністрацыйныя меры і сістэму індывідуальных кантрактаў з працоўнымі, што падпісвалі ў асноўным на тэрміны ад аднаго да пяці гадоў, для абмежавання кольнасці сябраў незалежных прафсаюзаў, а таксама рэгіянальных, нацыянальных і міжнародных арганізацый працоўных.

4 красавіка Вярхоўным суд пакінуў без зменаў рашэнне суда ніжэйшай інстанцыі адмовіць актывісту РЭП Анатолю Аскерку ў аднаўленні на працы. Аскерку звольнілі з нямецкага прадпрыемства "Фрэбар" пасля таго, як ён паведаміў наймальніку, што падпіша кантракт тэрмінам на адзін год толькі пасля таго, як скарыстаецца з свайго права на абмеркаванне некаторых палажэнняў.

**BELARUS**

У жніўні ў Гомелі суд прыгаварыў дзвюх асобаў да пазбаўлення волі на тэрміны пяць і шэсць гадоў за напад у чэрвені 2007 года на Аляксандра Бераснёва, актывіста РЭП і супрацоўніка дзяржаўнага сельскагаспадарчага прадпрыемства "Беларусьнафта-Асобіна". Напад адбыўся на тэрыторыі прадпрыемства ў хуткім часе пасля таго, як Бераснёў падаў скаргу на імя галоўнага інспектара па Гомельскай вобласці па фактах парушэнняў "Беларусьнафтай-Асобіна" працоўнага занакадаўства і неналежнага абыходжання з працоўнымі. Суд не пастанавіў аднавіць Бераснёва на працы, але абавязаў прадпрыемства выплаціць яму ў якасці кампенсацыі за нанесеную "маральную шкоду" 5 мільёнаў беларускіх рублёў (2 320 даляраў).

У студзені Савет міністраў разглядаў праект новых заканадаўчых палажэнняў, што закліканыя спрасціць патрабаванні да рэгістрацыі і паменшыць колькасць імёнаў і адрэсаў сябраў, неабходных для рэгістрацыі. Кіраўнікі і праўрадавых, і незалежных прафсаюзаў былі занепакоеныя тым, які ўзровень кантролю над прафсаюзамі атрымае ўрад паводле новых палажэнняў. Па стане на канец года, вынікі разгляду на Савеце міністраў не былі вядомыя.

9 студзеня Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі прафсаюзу малога і сярэдняга бізнэсу "Разам", спаслаўшыся на адсутнасць пратаколу ўстаноўчага сходу прафсаюза, аплаты рэгістрацыйных пошлін і неабходных дакументаў. Паводле слоў лідэра "Разам" Мікалая Канаха, працэдура рэгістрацыі "празмерна складаная"; ён настойваў на тым, што ў міністэрства былі пададзеныя правільна аформленыя дакументы.

Улад таксама рабіў захады супраць лідэраў і актывістаў прафсаюзаў. Аднак у параўнанні з папярэднімі гадамі, паступала менш звестак пра такія выпадкі. На працягу года больш як 30 сябраў РЭП былі вымушаныя выйсці з прафсаюза, таму што ім пагражалі звальненнем.

б) права на самаарганізацыю і калектыўнае вядзенне перамоваў

Закон прадугледжвае права працоўных на права самаарганізацыю і калектыўнае вядзенне перамоваў, аднак улады і кіраўніцтва дзяржаўных прадпрыемстаў стала ўмешваліся ў дзейнасць прафсаюзаў і перашкаджалі працоўным у іх спробах калектыўна весці перамовы, у некаторых выпадках адвольна прыпынялі дзеянне калектыўных пагадненняў.

З 2004 года ўрад патрабуе ад работнікаў дзяржаўных установ, якія складаюць каля 80 адсоткаў працоўнага насельніцтва, каб яны

падпісвалі кароткатэрміновыя працоўныя кантракты. Хаця такія кантракты можна падпісваць на тэрмін ад аднаго да пяці гадоў, бальшыню падпісвалі на адзін год, што давала ўладам магчымасць звольніць любога супрацоўніка, проста адмовіўшыся падоўжыць з ім кантракт. Многія сябры незалежных прафсаюзаў, палітычных партый і грамадзянскіх арганізацый згубілі працу ў выніку прымянення гэтай практыкі.

11 жніўня ў Брэсце кіраўніцтва прадпрыемства “Рыёна” прымусіла 11 з 12 сябраў РЭП выйсці з прафсаюза пад пагрозай нявыплаты заробкаў пасля таго, як РЭП зрабіў спробу паказаць, што прапанаваныя сябрам умовы працы ёсць шкоднымі, каб яны маглі атрымаць адпаведную кампенсацыю.

На працягу года Полацкае аддзяленне СПБ працягвала беспаспяховыя перамовы з адміністрацыяй Полацкага прадпрыемства “Шкловалакно” па прычыне нежадання прадпрыемства дазваліць СПБ карыстацца тымі ж паўнамоцтвамі, якімі карыстаецца канкурэнт арганізацыі, праўрадавая ФПБ.

У адрозненне ад папярэдняга прыкладу, у Баранi прадпрыемства “Лёс” спыніла ціск на сябраў Свабоднага прафсаюза металістаў, каб тыя выйшлі з прафсаюза і далучыліся да ФПБ.

Няма спецыяльных палажэнняў закона, якія б рэгулявалі працоўныя адносіны ў шасці свабодных эканамічных зонах краіны.

в) забарона на прымусовую і абавязковую працу

Закон забараняе прымусовую і абавязковую працу, у тым ліку дзіцячую, аднак паступалі паведамленні пра вываз жанчын, мужчын і дзяцей за межы краіны для сексуальнай эксплуатацыі і прымусовай працы.

На працягу года ўлады абвясцілі некалькі суботнікаў, на якіх супрацоўнікі ўрадавых, дзяржаўных установаў і многіх прыватных прадпрыемстваў былі абавязаныя працаваць у суботу, і заробкі пералічыць на фінансаванне дзяржаўных сацыяльных праграм. Супрацоўнікаў, што адмаўляліся ўдзельнічаць, штрафавалі і запалохвалі наймальнікі і ўлады.

г) забарона на выкарыстанне дзіцячай працы; мінімальны ўзрост для працаўладкавання

Закон забараняе працоўную эксплуатацыю дзяцей, у тым ліку прымусовую і абавязковую працу, і вызначае прымальныя умовы працы. Урад у асноўным выконваў гэтыя законы на практыцы.

**BELARUS**

Мінімальны ўзрост для працаўладкавання - 16 гадоў. Пры наяўнасці пісьмовай згоды аднаго з бацькоў ці афіцыйнага апекуна працоўнае пагадненне можа падпісваць 14-гадовы падлетак. Генеральная пракуратура ў асноўным эфектыўна сачыла за выкананнем закона. Непаўналетнім асобам да 18 гадоў было дазволена займацца працай у няшкодных умовах, аднак забаронена працаваць звыштэрмінова, у выходныя дні і дзяржаўныя святы. Праца не павінна была шкодзіць здароўю падлетка і перашкаджаць атрыманню адукацыі.

д) прымальныя ўмовы працы

Па стане на 1 лістапада, мінімальная заработная плата складала 220 080 беларускіх рублёў за месяц (каля 102 даляраў), што не магло забяспечыць прымальны ўзровень жыцця работніка і яго сям'і. У перыяд са студзеня па верасень сярэдні заробак быў на ўзроўні 857 000 беларускіх рублёў за месяц (398 даляраў).

Закон абмяжоўвае звычайны працоўны тыдзень 40 гадзінамі і прадугледжвае не менш як суткі адпачынку за тыдзень. Складанае эканамічнае становішча краіны вяло да таго, што многія працавалі значна менш за 40 гадзін на тыдзень, а заводы часта адпраўлялі працоўных у адпачынак без аплаты ў сувязі з адсутнасцю попыту на прадукцыю прадпрыемства. Закон прадугледжвае абязковую аплату за звыштэрміновыя гадзіны працы і аплочаны адпачынак, а таксама абмяжоўвае звыштэрміновую працу чатырма гадзінамі кожныя 2 дні, а максімальную колькасць звыштэрміновых гадзін - ста дваццаццю на працягу года. Паводле наяўных звестак, урад эфектыўна кантраляваў выкананне гэтых нормаў.

Закон вызначае мінімальныя патрабаванні да бяспекі ўмоў працы і да аховы здароўя працоўных, аднак часта наймальнікі ігнаравалі гэтыя нормы. Працоўныя на многіх прадпрыемствах цяжкага машынабудавання не карысталіся нават мінімальнымі сродкамі бяспекі. Ёсць дзяржаўная інспекцыя па працоўнай бяспецы, аднак яна не мела дастатковых паўнамоцтваў, каб прымусіць наймальнікаў выконваць патрабаванні, і часта пакідала парушэнні без увагі.

Міністэрства працы паведаміла, што ў перыяд са студзеня па ліпень на працоўных месцах загінулі 120 чалавек – на 1,6 адсоткі менш, чым на працягу адпаведнага перыяду ў 2007 годзе. Паводле паведамленняў міністэрства, няшчасныя выпадкі на працоўных месцах адбываліся па прычынах неасцярожнасці, кепскіх умоў працы, няспраўнага абсталявання і кепскай падрыхтоўкі і навучання. У 32 адсотках выпадкаў гібелі на вытворчасці і ў 10 адсотках выпадкаў атрымання цялесных пашкоджанняў працоўныя знаходзіліся пад уздзеяннем алкаголю. Закон не забяспечвае права

працоўных адмовіцца ад выканання работ у небяспечных і шкодных умовах і не рызыкаваць пры гэтым страціць працу.